

**Жыллё: выгадней пабудаваць ці купіць?**

СТАР. 5



**І ў страўніка бываюць ворагі...**

СТАР. 6



**Здольнасці чалавека — па адбітках пальцаў**

СТАР. 8



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 чэрвеня 2015 г. СЕРАДА № 103 (27961) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## ЯК ДОБРЫЯ СУСЕДЗІ

### Наша краіна і Пскоўская вобласць Расіі маюць намер нарошчваць узаемадзеянне па шырокім спектры напрамкаў

**Пра гэта ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з губернатарам Пскоўскай вобласці Андрэем Турчаком, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў занепакоенасць тым, што тавараабарот Беларусі з Пскоўскім рэгіёнам наогул невысокі. З 2012 года гэты паказчык зніжаецца, пры тым што паміж Віцебскай і Пскоўскай абласцямі за апошнія пяць гадоў ён вырас больш чым у 4 разы і склаў каля $50 млн.

Беларускі бок, паводле слоў Прэзідэнта, ацэньвае візіт пскоўскай дэлегацыі як своечасовы і неабходны, паколькі сітуацыю ў гэтым плане трэба выпраўляць. У ліку перспектыўных сфер узаемадзеяння Аляксандр Лукашэнка назваў сельскую гаспадарку, прамысловасць, будаўніцтва. «Мяркую, што кіраўніцтва вобласці ў хуткім часе прыме рашэнне адносна пілотнага праекта па ўзвядзенні жылля сіламі беларусаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што такога кшталту супрацоўніцтва Беларусь прапануе шматлікім расійскім рэгіёнам.

Беларускія спецыялісты гатовы прымяніць свае веды пры ўзвядзенні інфраструктурных аб'ектаў да чэмпіянату свету па біятлоне сярод юнакоў і юніёраў, які пройдзе ў Пскоўскай вобласці ў 2017 годзе. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў Беларусі ёсць вопыт у правядзенні падобных спаборніцтваў, і прапанаваў гасцям азнаёміцца з пабудаванымі аб'ектамі.

У Пскоўскай вобласці плануецца маштабнае абнаўленне парка пасажырскай тэхнікі. З беларускімі аўтобусамі ў гэтым расійскім рэгіёне ўжо добра знаёмы, і, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, наша краіна гатова нарошчваць іх пастаўкі. Госці таксама выказалі зацікаўленасць у набыцці беларускай аўтамабільнай і камунальнай тэхнікі. «Калі вам спатрэбіцца наша станочнае абсталяванне для мадэрнізацыі прамысловых прадпрыемстваў, мы таксама гатовы ў гэтым плане разам з вамі працаваць», — сказаў Прэзідэнт.

Яшчэ адна сфера, якая адкрывае значныя магчымасці для развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, — агракомплекс. Так, Беларусь на аснове свайго вопыту гатова супрацоўнічаць з Пскоўскай вобласцю ў вырошчванні і перапрацоўцы лёну. Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што ў Пскоўскай вобласці шырока займаюцца меліярацыяй земляў, а Беларусь ужо каторы год праводзіць меліярацыйныя мерапрыемствы, затрачваючы на гэта немалыя сродкі. У краіне будуць толькі ўзмацняць дадзены кірунак. Пад яго створана шмат тэхнікі. Назапашаны пэўны вопыт, ім беларускі бок, як заўважыў Прэзідэнт, таксама гатовы падзяліцца. Расійскі бок выказаў зацікаўленасць і ва ўзаемадзеянні ў частцы селекцыйнай працы, племяннай жывёлагадоўлі.

Паводле слоў губернатара Пскоўскай вобласці, на Беларусь і Пскоўскую вобласць, як на самых найбліжэйшых суседзяў, не распаўсюджваюцца звязаныя з межамі ўмоўнасці. «Пранікненне і гуманітарных, і эканамічных кантактаў мае глыбокія гістарычныя карані», — лічыць Андрэй Турчак. Разам з тым, на яго думку, сёння надышоў момант пашыраць і паглыбляць эканамічныя сувязі паміж Беларуссю і Пскоўскай вобласцю.

# Гаспадарка — любата!




Учора ў Мінску адкрылася Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра», якая выклікала зацікаўленасць не толькі ў спецыялістаў аграрнага сектара, але і звычайных наведвальнікаў, у тым ліку і дзяцей.





Фота БЕЛТА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй КАБЯКОЎ,** прэм'ер-міністр:

*«Інфляцыя ў краіне прыкметна зніжаецца. Калі ў першыя два месяцы года цэны выраслі на 4,1%, у сакавіку-красавіку — на 1,7%, то ў маі, як паказваюць папярэднія замеры, інфляцыя складзе 0,3%, максімум — 0,4%. Такім чынам, параметры інфляцыі, якія называў Нацбанк (18%, плюс-мінус 2%), дасягальныя. Мы на гэта настроены і мяркуем, што так і павінна быць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14912,00 | ▲ |
| Еўра | 16324,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 279,12 | ▲ |
| Укр. грыўня | 705,89 | ▲ |

## УМОВЫ ДЛЯ СТВАРЭННЯ ПРАФСАЮЗАЎ СПРАШЧАЮЦЦА

**Гэта прадугледжана дэкрэтам №4, які кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 2 чэрвеня, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дэкрэтам №4 уносяцца змяненні і дапаўненні ў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1999 №2 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў».

Дакумент распрацаваны з улікам правапрымяняльнай практыкі і інтарэсаў прафесійных саюзаў. Дзеючыя прававыя нормы прыводзяцца ў адпаведнасць з рэальнымі ўмовамі стварэння і дзейнасці прафесійных саюзаў. Так, выключаецца палажэнне аб неабходнасці наяўнасці не менш за 10% працуючых (навучэнцаў) ад іх агульнай колькасці на прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі для стварэння і дзейнасці там прафсаюза.

Акрамя таго, прыведзены ў адпаведнасць з дзеючым заканадаўствам асобныя прадпісанні Палажэння аб дзяржаўнай рэгістрацыі (перарэгістрацыі) прафесійных саюзаў і іх саюзаў (асацыяцый).

Унесеныя змены ствараюць больш спрыяльныя ўмовы для дзейнасці прафсаюзаў, рэалізацыі і абароны сацыяльна-працоўных правоў і інтарэсаў работнікаў.

Дэкрэт №4 уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

■ Сацыяльны рэпартаж

## «Прыйду ў любое надвор'е»

### Цяжка ўявіць, як бы выжывалі адзінокія старыя, калі б не сацыяльная служба

**Ніна Нікалайчык жыве ў Баранавічах. Яна сацработнік, абслугоўвае дзевяць падапечных. Сваёй працай задаволена, хоць яе нельга назваць лёгкай або прэстыжнай. Між тым патрэба грамадства ў гэтых спецыялістах расце і будзе расці далей. Што рабіць — нацыя старэе... Ці лёгка быць сацработнікам? Да чаго трэба быць гатовымі, з якімі складанасцямі можна сутыкнуцца? Мы правялі адзін дзень з Нінай Нікалайчык, каб знайсці адказы на гэтыя пытанні.**

СТАР. 3



Сацработнік Ніна Нікалайчык са сваёй падапечнай Рымай Мікалаеўнай.

■ Прыёмная кампанія — 2015

## РЭГІСТРАЦЫЮ ПРАЙШЛІ!

### Беларускую мову на ЦТ выбраў кожны чацвёрты абітурыент

**4,5 тысячы чалавек прыйшлі ў пункты рэгістрацыі на ЦТ у апошні дзень — 1 чэрвеня. Але ўжо раніцай 2 чэрвеня тэлефон у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў распаліўся ад званкоў — арганізатарам ЦТ тэлефанавалі абітурыенты, якія «забыліся» завітаць па пропуск у вызначаныя тэрміны. Яны цікавіліся, дзе можна зарэгістравацца, і прасілі іх зарэгістраваць... у парадку выключэння.**

— У гэтым годзе была ўведзена новая норма, што дазваляе падаваць дакументы на рэгістрацыю, а таксама атрымліваць сертыфікат ЦТ прадстаўнікам абітурыента — у выпадку адсутнасці ў яго самога такой магчымасці па ўважлівай прычыне, — тлумачыць **дырэктар інстытута Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Таму ніякія тлумачэнні кшталту «я хварэў» ці «мяне не было ў краіне» мы не прымаем. Правілы — агульныя для ўсіх. А месяц — дастатковы тэрмін для таго, каб прайсці працэдуру рэгістрацыі. Увогуле, мы заўважылі, што ў апошні дзень рэгістрацыі нашы пункты ніколі не пустуюць, нават калі ён выпадае на выхадны.

СТАР. 3

**УВАГА!**

**Сёння «Прамая лінія»**

### ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ У ПОБЫЦЕ

Бадай, кожны з нас марыць пра цёплы і ўтульны дом. Яшчэ лепей, калі ён не патрабуе вялікіх выдаткаў на ўтрыманне. Дасягнуць гэтага можна дзякуючы энергазберажэнню. Галоўнае рабіць усё з розумам. Ці насамрэч энергазберагальныя лямпачкі даюць значную эканомію электрычнасці? Класы энергаэфектыўнасці бытавой тэхнікі — рэкламны ход ці рэальная выгада? Як не аплачваць за лішняе ацяпленне? На гэтыя і іншыя пытанні сёння, **3 чэрвеня, з 11.00 да 12.00** падчас «прамой лініі» ў рэдакцыі газеты «Звязда» адказа **намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей Аляксандравіч СЯМАШКА.**

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефоне: **8 (017) 287 18 71.** Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі **(info@zvyazda.minsk.by)** або задавайце па тэлефонах: **8 (017) 292 38 02 ці 8 (017) 287 17 51.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Крушэнне «Зоркі Усходу»



На рацэ Янцзы затануў цеплаход «Зорка Усходу», на борце якога знаходзіліся 47 членаў экіпажа, пяць турыстычных гідаў і 405 пасажыраў. Усе яны — грамадзяне Кітая. Сярод пасажыраў былі ў асноўным пажылыя людзі. Пра гэта паведамляе агенцтва «Сіньхуа». Цеплаход перавярнуўся падчас моцнага шторму і патануў на працягу дзвюх хвілін. Па апошняй інфармацыі, выратаваны 13 пасажыраў і членаў экіпажа, знойдзены целы пяцярых загінулых. Вадалазы не выключаюць, што ўнутры затопленага корпуса маглі ўтварыцца «паветраныя мяшкі», у якіх могуць заставацца жывыя людзі. Кітайская паліцыя арыштавала капітана і старэйшага механіка цеплахода.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з трагедыяй выказаў спачуванні кіраўніцтву Кітая і ўсяму кітайскаму народу.**

### Журы Нобелеўскай прэміі па літаратуры ўпершыню ўзначаліла жанчына



Пісьменнік, літаратуразнаўца і літаратурны крытык Сара Даніус абрана пастаянным сакратаром Шведскай акадэміі, члены якой штогод прысуджаюць Нобелеўскую прэмію па літаратуры. Упершыню гэты пост заняла жанчына. Адначасова як старшыня журы міжнароднай прэміі Даніус у гэтым годзе абвесціць імя лаўрэата. Яна валодае крэслам № 7 у сходзе — гэтае месца раней належала пісьменніцы Сельме Легерлёф (яна стала першай жанчынай, якая атрымала Нобелеўскую прэмію па літаратуры). 53-гадовы прафесар літаратуразнаўства Сара Даніус нарадзілася ў Стакгольме. Яна піша літаратурныя рэцэнзіі, спецыялізуецца на творчасці Марсэля Пруста, Густава Флабера і Джэймса Джойса.

### У паўднёваафрыканскім парку львіца напала на пару ў аўтамабілі

Амерыканская турыстка забіта львіцай у папулярным ільвіным парку недалёка ад сталіцы ПАР. Звер скокнуў у прыадчыненае бакавое акно аўтамабіля, што ехаў па тэрыторыі парку. У салоне машыны знаходзілася маладая пара — мужчына і жанчына, якія атрымалі цяжкія раненні. Жанчына пазней памерла ад атрыманых ран, мужчына быў шпіталізаваны ў цяжкім стане. Гібель амерыканкі — трэцяя смерць турыста ў парку з пачатку 2015 года. Пасля нападу на чалавека ахова парку праследавала звера, аднак забіць яго ніхто не наважыўся. Ільвіны парк размешчаны ў 30 кіламетрах на поўнач ад Ёганесбурга і з'яўляецца папулярным месцам адпачынку. Сем'і львоў сабраны тут у вялікія ахоўныя вальеры, праз якія могуць праехаць наведвальнікі, разглядаючы дзікіх звяроў наўпрост з акна аўтамабіля. Аднак апускаць шкло ў машыне катэгарычна забаронена правіламі ўнутранага распарадку заасада.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У Канадзе тытунёвыя кампаніі выплацяць кампенсацыю недасведчаным курцам

У Канадзе суд абавязаў тытунёвыя кампаніі выплаціць 15 500 000 000 канадскіх долараў (каля 12 мільярдаў долараў ЗША) курцам, якія не ведалі пра шкоду тытуню. Рашэнне суда тычыцца трох буйных кампаній: Imperial Tobacco, Rothmans Benson & Hedges і JTI-MacDonald. Усе яны маюць намер падаць апеляцыю. Істцамі выступілі дзве групы, якія аб'ядналі каля мільёна чалавек. Першая група ўключае ў сябе тых, хто праз курэнне набыў сур'ёзныя захворванні, другая — гэта людзі, якія сцвярджаюць, што яны не ў стане кінуць паліць. Многія з іх прызвычаіліся да тытуню да 1976 года, калі інфармацыя пра шкоду курэння не даводзілася да спажыўцоў. Сума, якую ўдалося адсудзіць, будзе размеркавана наступным чынам: істцы, хворыя на рак, атрымаюць ад 72 да 80 тысяч амерыканскіх долараў кампенсацыі. Хворым на эмфізему належыць ад 19 да 24 тысяч долараў. Асноўная маса істцоў (людзі, якія не могуць кінуць паліць) атрымаюць па 104 долары кампенсацыі.

КОРАТКА

Для бюджэтных арганізацый Беларусі ўстаноўлены адзіны страхавы тарыф па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў. Гэта прадугледжана ўказам № 221, які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 1 чэрвеня.

**Усе выратавальныя станцыі і пасты АСВОД Беларусі пераведзены ў рэжым павышанай гатоўнасці ў сувязі з надыходам цяпла і школьнымі канікуламі.**

Падатковыя органы Беларусі правядуць татальныя кантрольныя мерапрыемствы адносна суб'ектаў гаспадарання сфер гандлю і паслуг у частцы выканання парадку прыёму наяўных грашовых сродкаў.

**Больш актыўнаму пашырэнню беларускіх прадуктаў харчавання на еўрапейскі рынак перашкаджае не іх якасць, а ўстаноўленыя там загараджальныя бар'еры, якія абараняюць айчыннага вытворцу. Так лічыць міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «У ГАЗЕЦЕ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ НЕШТА...»

**Марыя ШАПЕЦЬКА, студэнтка трэцяга курса гістарычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны:**



— У «Звяздзе» мне вельмі падабаецца спецвыпуск «Ігуменскі тракт», дзе я заўсёды знаходжу вельмі цікавыя гісторыі аб населеных пунктах, дзе жылі нашы продкі, выбітных дзеячах беларускай культуры, невядомых старонках гісторыі Беларусі. Заўсёды ёсць нешта, што, магчыма, і не заўважыла б, калі б не публікацыі. Мне цікава чытаць пра гістарычныя падзеі, звычаі беларускага народа...

Прываблівае і ваша «Чырвонка» — газета для маладых у газеце для дарослых. Мне заўсёды цікава даведвацца, якім чынам мае равеснікі дасягаюць пэўных вяршынь у вучобе, навуцы і творчасці. Прызнаюся, што часам чытаю і рубрыку «Усё пра Еву». Правільныя стасункі паміж мужчынамі і жанчынамі — гэта ж заўсёды актуальна. Дарэчы, мае бацькі ў «Звяздзе» чытаюць старонкі «Сямейнай газеты» і «Жырандолі», а бабуля з дзядулем імкнуцца прытрымлівацца каментарыяў спецыялістаў у «Краіне здароўя» і парад па вырошчванні садавіны-агародніны з апошняй старонкі газеты.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — АГУЛЬНАЯ ВЫГАДА

## Чым мы цікавыя для Індыі

**Апошнім часам супрацоўніцтвам з нашай краінай сур'ёзна цікавяцца найбуйнейшыя краіны свету. Колькі тыдняў таму Мінск з афіцыйным візітам наведаў Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін, прычым прабыў ён тут тры дні. Гэта сведчыць пра тое, што супрацоўніцтву з Беларуссю ў Паднябеснай надаецца значная ўвага. Учора ў нашу сталіцу прыбыў Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы, таксама з афіцыйным візітам.**

Сённяшняя Індыя — гэта не толькі краіна з велізарным мноствам нацыянальнасцей і моў і найстаражытнейшай культурай, не толькі імперыя кінаіндустрыі Балівуд, цэнтр будызму. Акрамя ўсяго вышэйпералічанага, Індыя лічыцца самай хуткарастучай эканомікай свету, а па аб'ёме ВУП у мінулым годзе яна саступіла толькі Злучаным Штатам і Кітаю.

Чым жа цікавая наша дзяржава для Індыі? Як падкрэсліў напярэдадні свайго візіту ў Мінск Прэзідэнт гэтай краіны Пранаб Мукерджы, Беларусь, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўразіі, — гэта «мост паміж Еўропай і Азіяй». Таму развіццё ўзаемнага супрацоўніцтва пойдзе на карысць абедзвюм краінам, тым больш што ў многім яны вельмі блізкія.

### У НАС ШМАТ АГУЛЬНАГА

У сваёй знешняй палітыцы Індыя лічыць сябе нашчадкам Гаутамы Будды і Махатмы Гандзі. Менавіта мірнымі дзеяннямі, заснаванымі на філасофіі ненасілля, Гандзі імкнуўся дамагчыся незалежнасці для сваёй краіны. «Наша прыхільнасць дэмакратыі, міру, вяршэнства закону, рэлігійнай цярпімасці і ненасілля з'яўляецца непарушнай, — заявіў у адным са сваіх апошніх інтэрв'ю Пранаб Мукерджы. — Мы з'яўляемся самай буйной дэмакратыяй у свеце і членам — заснавальнікам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а таксама Брэтон-Вудскіх устаноў. Лічым, што ўсе ўнутраныя канфлікты, а таксама разыходжанні ў знешняй палітыцы павінны вырашацца мірным шляхам і без ужывання сілы». З 1947 года, калі Індыя набыла незалежнасць ад Вялікабрытаніі, яна пастаянна выступала на міжнароднай арэне за спыненне войнаў і канфліктаў, за ўсеагульнае раззбраенне. Калі ў канцы 1940-х гадоў складаныя праблемы, якія стаялі перад краінай (першы ваенны канфлікт з Пакістанам пачаўся ўжо ў кастрычніку 1947 года), перашкаджалі актыўнаму ўключэнню ў сусветную палітыку, то з пачатку 1950-х гадоў на міжнародных форумах Індыя ўсё больш актыўна стала выступаць супраць любых відаў агрэсіі, расізму, каланіялізму і нарошчвання гонкі ўзбраенняў.

Тут нескладана правесці паралель з Беларуссю, якая ў першыя гады сваёй незалежнасці на справе, а не на словах даказала сваю прыхільнасць да прынцыпаў мірнай знешняй палітыкі — адмовілася ад ядзернай зброі і нават у самых складаных знешнепалітычных умовах імкнецца захаваць нейтралітэт. Што ж да савецкіх часоў, то ўжо тады БССР, краіна-заснавальніца ААН, актыўна выступала супраць каланіялізму, распрацоўкі новых небяспечных відаў зброі.

**Індыя, як адна з самых буйных краін у свеце па колькасці насельніцтва, можа «падняць» турыстычную галіну любой краіны: індусы вельмі актыўна падарожнічаюць. Але, на жаль, пра Беларусь там пакуль што мала ведаюць.**

Зноў жа, калі казаць пра сучасную знешнюю эканамічную палітыку, то сёння і Індыя, і Беларусь зацікаўлены ў рэгіянальным супрацоўніцтве. Беларусь, якая ўваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз і мяжуе з Еўрапейскім саюзам, можа даць Індыі магчымасці выйсці як на рынак ЕАЭС, так і стаць бліжэйшай да Еўропы.

### ФРАГМЕНТЫ АДНОЙ МАЗАІКІ

Прэзідэнт нашай краіны не раз казаў пра тое, што паказчыкі тавараабароту з Індыяй пакуль невялікія. У прыватнасці падчас сустрэчы ў 2013 годзе са спікерам Народнай палаты Парламента Індыі Мейрай Кумар, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў «пераходзіць ад простага тавараабмену да кааперацыйных сувязяў, ствараць сумесныя прадпрыемствы, <...> паглыбляць нашы гандлёва-эканамічныя адносіны». З гэтым згаджаецца і Прэзідэнт Індыі. Па яго меркаванні, «сённяшні ўзровень узаемнага гандлю, які складае каля $400 млн, значна ніжэйшы за існуючы патэнцыял».

На думку індыйскага боку, ёсць вялікі патэнцыял для супрацоўніцтва з нашай краінай у такіх сектарах, як традыцыйная і малая энергетыка, новыя і аднаўляльныя крыніцы энергіі, металургія і горназдабыўная прамысловасць, аўтамабільная і сельскагаспадарчая тэхніка, фармацэўтыка, нафта і газ, сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць.

Сфера энергетыкі ўжо задзейнічана ў эканамічных стасунках паміж краінамі. Індыйская кампанія прыняла ўдзел у мадэрнізацыі Гродзенскай ТЭЦ-2. Праект рэалізоўваўся з прыцягненнем крэдытных сродкаў Экспартна-імпартнага банка Індыі. Увогуле ж, энергетыка — развітая сфера ў Індыі, і, як заўважыў напярэдадні свайго візіту ў Беларусь Пранаб Мукерджы, індыйскі бок гатовы прыняць удзел і ў іншых падобных праектах.

Індыя — індустрыяльна-аграрная краіна, таму вялікія перспектывы ў дадзеным выпадку ёсць у стварэнні беларускімі машынабудаўнічымі заводамі на яе тэрыторыі сумесных прадпрыемстваў. Іх прадукцыя без асаблівых цяжкасцей знойдзе збыт на велізарным індыйскім рынку.

Фармацэўтыка і інфармацыйныя тэхналогіі ў пэўным сэнсе з'яўляюцца брэндамі сучаснай Індыі. Таму тут ужо Беларусь зацікаўлена ў тым, каб адпаведныя кампаніі прыйшлі да нас. Ужо ў 2015 годзе ў нас з'явіцца першае сумеснае прадпрыемства па выпуску лекаў. У планах — запуск і новай лініі прэпаратаў, якія будуць дапамагаць хворым на ВІЧ. Што да супрацоўніцтва ў сферы інфармацыйных тэхналогій, то, як гэта ні парадаксальна, нам не трэба баяцца канкурэнцыі. Наконт гэтага Прэзідэнт Індыі выказаў упэўненасць, што канкурэнцыі гэтай зараз і няма. «Індыя стварыла навучальны IT-цэнтр у Мінску, які забяспечыў высокі ўзровень падрыхтоўкі многіх беларускіх IT-спецыялістаў, — адзначыў ён. — Мы лічым, што перавагі дзвюх краін у гэтай галіне павінны стымуляваць пашырэнне супрацоўніцтва. Нашы кампаніі могуць супрацоўнічаць і сумесна прадастаўляць паслугі на міжнародным і рэгіянальных рынках».

Зацікаўлена Індыя і ў імпарце калійных угнаенняў з нашай краіны. Па меркаванні індыйскага боку, гэта дасць магчымасць ім выканаць сваю праграму харчовай бяспекі, а Беларусь пры гэтым атрымае гарантаваны рынак збыту. Пры гэтым індыйскія кампаніі выказваюць зацікаўленасць у тым, каб укладваць інвестыцыі ў беларускія руднікі — у тым выпадку, калі такога кшталту супрацоўніцтва будзе абяцаць камерцыйную выгаду.




Як бачым, у эканамічным плане Беларусь і Індыя ўзаемадапаўняльныя, як фрагменты адной мазаікі.

* * *

Візіт Прэзідэнта Індыі ў нашу краіну, падпісанне сумеснай дарожнай карты беларуска-індыйскага супрацоўніцтва не толькі дадуць новы імпульс узаемадзеянню краін у чыста эканамічнай сферы. Раней наша газета ўжо пісала пра тое, наколькі б ажывілася супрацоўніцтва нашых краін з павелічэннем турыстычнага патоку. У спецыяльным інтэрв'ю «Звяздзе» Пасол Індыі ў Мінску спадар Манодж Кумар Бхарці падкрэсліў, што Індыя, як адна з самых буйных краін у свеце па колькасці насельніцтва, можа «падняць» турыстычную галіну любой краіны: індусы вельмі актыўна падарожнічаюць. Але, на жаль, пра Беларусь там пакуль што мала ведаюць. Пасля візіту Прэзідэнта Індыі ў Беларусь наша краіна стане там сапраўды вядомай. І хто ведае, можа, праз год у нашых санаторыях будуць адпачываць і індускія сем'і!

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# НАВАСЕЛЛЕ ДЛЯ САМЫХ МАЛЕНЬКІХ

## У Самахвалавічах адкрыты новы корпус дзіцячага садка

**Добры падарунак атрымалі малыя пасёлка Самахвалавічы, што ў Мінскім раёне. У Міжнародны дзень абароны дзяцей тут адкрыўся новы корпус дзіцячага садка на 95 месцаў. Раней будынак дашкольнай установы мог прыняць толькі 60 выхаванцаў.**



Фота БЕЛТА.

Новы будынак пабудавалі за чатыры месяцы. Для малых тут гульнявыя і спальныя пакоі, фізкультурная і музычная залы, камп'ютарны клас. Па жаданні бацькоў яны змогуць браць дадатковыя ўрокі — па развіцці мовы, замежных мовах, харэаграфіі. Асаблівая ўвага — харчаванню выхаванцаў. Дзякуючы спецыяльнаму абсталяванню яны будуць атрымліваць стравы, прыгатаваныя на пары.

На думку загадчыцы садка Алены Ярашэвіч, гэтая ўстанова дазволіць пазбавіцца чаргі ў дзіцячыя дашкольныя ўстановы ў пасёлку і блізкіх ад яго населеных пунктах.

Умовы, створаныя для малых у садку, парадавалі бацькоў, усіх ахвотных, хто пабываў на ўрачыстай цырымоніі яго адкрыцця з удзелам старшыні Мінаблвыканкама Сямёна Шапіры. У прыватнасці, кіраўнік цэнтральнага рэгіёна падкрэсліў, што тут прадугледжана ўсё неабходнае, каб дзеці раслі здаровымі, добра развіваліся. «Сёлета на Міншчыне будуць пабудаваны яшчэ 4 дзіцячыя садкі. У рэгіёне ўдалося захаваць высокі ўзровень вытворчасці, што паўплывала на тэмпы будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў, у тым ліку і дзіцячых садкоў», — адзначыў ён.

Па словах начальніка ўпраўлення адукацыі аблвыканкама Галіны Казак, у ліпені мяркуецца ўвесці ў дзеянне новы садок на 160 месцаў у Дзяржынску. Пачнецца будаўніцтва дашкольных устаноў у Барысаве, вёсцы Ляскоўка Мінскага раёна, а ў пасёлку Мачулішчы пад дзіцячую ўстанову будзе рэканструявана памяшканне.

Усяго за 5 апошніх гадоў на Міншчыне ўзведзена 8 дзіцячых садкоў, якія наведваюць 1,7 тыс. выхаванцаў. Толькі летась у вобласці створана больш як 950 месцаў у садках. У цэлым дашкольнікі забяспечаны месцамі ў дзіцячых садках на 107%. Але ў некаторых раёнах і асобных паселішчах іх не хапае. Асабліва гэта тычыцца Мінскага раёна, дзе гэты паказчык складае толькі 62,7% ад неабходнага. Таму асаблівая ўвага ў далейшым будзе надавацца вырашэнню праблемы ў гэтых пунктах.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ТРАНСПАРТ ІДЗЕ НА «КАНІКУЛЫ»

**У сувязі з сезонным зніжэннем пасажырапатоку на летні перыяд будуць унесены змены ў расклад шэрагу сталічных маршрутаў гарадскога транспарту, у тым ліку прадугледжана змяншэнне колькасці рэйсаў.**

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», з 6 чэрвеня (па выхадных днях) гэтыя змены датычацца 15 аўтобусных маршрутаў (№№9Д, 20С, 24, 42, 60, 118С і інш.) і 17 тралейбусных (№№9, 12, 22, 33, 37, 40, 61, 68, 92 і інш.). З 8 чэрвеня (па рабочых днях) такія ж змены ў раскладзе закрануць 32 аўтобусныя маршруты (№№1, 15, 27, 50С, 54, 62Э, 75, 95, 107, 144С і інш.), а таксама 30 тралейбусных маршрутаў (№№ 8, 10, 35Д, 47, 53, 77, 92 і інш.).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШАНЦ НА НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

**Пад амністыю, аб'яўленую да 70-годдзя Перамогі, трапіць больш за 8 тысяч асуджаных.**

Пры гэтым, як паведаміла **Жанна БАТУРЫЦКАЯ, начальнік упраўлення выканання прысудаў Дэпартамента па выкананні пакаранняў МУС,** лёс былога зняволенага пасля вызвалення не губляецца, а адсочваецца.

— Кожны чалавек, які вызваляецца паводле амністыі, ставіцца на ўлік у органах унутраных спраў. І працяглы перыяд пасля вызвалення ён знаходзіцца на кантролі па месцы жыхарства. Ні ў якім разе амніставаныя не выпадаюць з-пад увагі праваахоўных органаў.

Каб трапіць пад амністыю, людзі мусяць таксама цалкам пакрыць страты. Падчас мінулай амністыі асуджаныя на пазбаўленне волі агулам вярнулі больш за 10 мільярдаў рублёў, у 2012-м годзе — 7 мільярдаў.

У папраўчых установах ёсць рэспубліканскія ўнітарныя прадпрыемствы. «Усе людзі маюць магчымасці працаваць, і яны гэта робяць, — адзначыў Юрый Гарошка, начальнік аддзела па наглядзе за законнасцю выканання крымінальных пакаранняў Генеральнай пракуратуры. — Сярэдні заробак ва ўстановах адкрытага тыпу па стане на красавік складае амаль 3,8 мільёна рублёў, а ў папраўчых калоніях — 800 тысяч.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# НІ ХВАСТА І НІ ЛУСКІ! КАЛІ ЎСЁ ПА ПРАВІЛАХ

**Новы рыбалоўны сезон сёлета прыходзіць з поўдня. Брэсцкі і Гомельскі рэгіёны ўжо рыбачаць ва ўсю з 19 мая. З 31 мая абмежаванні знятыя яшчэ ў трох абласцях — Мінскай, Гродзенскай і Магілёўскай. Палавіць адразу на некалькі кручкоў на вадаёмах Віцебшчыны можна будзе ўжо з 9 чэрвеня.**

— Аднак заканчэнне вясенняй забароны не азначае, што рыбачыць можна дзе заўгодна і як заўгодна, — нагадвае **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.** — Рыбаловы павінны памятаць, што многія вадаёмы арандаваныя для арганізацыі прамысловага і платнага аматарскага рыбалоўства, там устаноўлены асаблівыя ўмовы. На некаторых водных аб'ектах ці іх участках рыбачыць увогуле нельга. Недзе дзейнічаюць абмежаванні па спосабах лоўлі, забаронена займацца падводным паляваннем і тролінгам, выкарыстоўваць адначасова вялікую колькасць кручкоў.

Лавіць інтэнсіўнымі спосабамі на вадаёмах запасу могуць толькі члены Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Іх узносы зараз мэтанакіравана павінны адлічвацца на зарыбленне. Згодна з новымі Правіламі рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, рыбакі — члены таварыства — могуць выкарыстоўваць да дзесяці кручкоў, у той час як усе астатнія — да пяці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЛЕТА СУСТРЭЛІ ПА-СПАРТЫЎНАМУ

**У алімпійскім спартыўным комплексе «Стайкі» прайшла спартакіяда «Здароўе» сярод супрацоўнікаў Міністэрства інфармацыі, друкаваных і электронных СМІ.**

Удзельнічала ў спаборніцтвах і наша выданне. У кросе гонар «Звязды» абараняла журналістка Наталля Лубнеўская, а ў спаборніцтвах па настольным тэнісе — спецыяльны карэспандэнт Тарас Шчыры. На п'едэстал пераможцаў нашы спартсмены не ўзняліся, але ў сваіх дысцыплінах былі далёка не апошнімі.

Паралельна ў Гаранях, у Цэнтры павышэння кіруючых работнікаў і спецыялістаў Дэпартамента аховы, найлепшых у спорце выяўлялі супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў. Акрамя звычайных відаў, праваахоўнікі змагаліся ў спартыўнай рыбалцы і нават у турніры па распілоўванні бервяна. Адметна, што за перыпетыямі сачылі славутыя беларускія спартсмены: кідальнік молата Вадзім Дзевятоўскі і штурхальніца ядра Наталля Міхневіч.

— З кожным годам здаровы лад жыцця становіцца ўсё больш папулярным. І гэта не проста даніна модзе, а жаданне самых розных пакаленняў захаваць маладосць і прыгажосць, — адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця **Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў,** які, як аказваецца, з'яўляецца вялікім аматарам фізкультуры і балельшчыкам нашай хакейнай зборнай.

**Якаў ЖУРБІН.**

# КАЛІ ЖЫЦЬ, ДЫК З КАМФОРТАМ

## Пераўтварэнне Бараўлян у горад-мару закладзена ў абласную праграму развіцця малых гарадоў

**Ці стануць Бараўляны такімі насамрэч? Пакажа час. Але, як задумана абласной праграмай развіцця малых гарадоў Міншчыны, адназначна ў пасёлку будзе больш камфорту для пражывання і магчымасцей для адпачынку.**



Ужо сёння на поўную моц ідзе добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, уладкаванне газонаў, дзіцячых пляцовак, азеляненне, асфальтаванне вуліц, укладка тратуарных дарожак, афарбоўка і рамонт фасадаў будынкаў. Словам, аб'ём работ значны, закончыць асноўныя з іх плануецца да 1 лістапада.

— Змены закранулі і сацыяльна-культурныя аб'екты, установы аховы здароўя, адукацыі: рэканструюецца Дом культуры, камбінат бытавога абслугоўвання — з тым, каб пашырыць спіс паслуг для насельніцтва. Заканчваецца будаўніцтва неабходнага для жыхароў спартыўна-аздараўленчага комплексу з басейнам, трэнажорнай залай, гульнявым цэнтрам для дзяцей. З'явіцца ў пасёлку і сетка новых аптэк, крамаў харчовых і бытавой хіміі, — распавяла **намеснік старшыні Мінскага райвыканкама па будаўніцтве Ірына САВІЦКАЯ.**

**Узводзіць жыллё ў Бараўлянах не плануецца. Тут ужо пражывае 30 тысяч чалавек, а ўсяго на тэрыторыі сельсавета ў 18 населеных пунктах — 45 тысяч. Далейшага прыросту не вытрымаюць інфраструктура і камунікацыі.**

Яшчэ адна праблема для Бараўлян — недахоп дзіцячых садкоў. Многія бацькі ўладкоўваюць сваіх дзяцей у сталічныя дашкольныя ўстановы. А гэта, пагадзіцеся, не вельмі зручна. На тэрыторыі сельсавета працуе 6 садоў. Каб цалкам задаволіць попыт, патрэбна яшчэ як мінімум 5. Улады абяцаюць зняць дэфіцыт. Ужо сёлета пачнецца будаўніцтва сучаснай дзіцячай установы на 230 месцаў у вёсцы Ляскоўка. Што тычыцца школ, то іх таксама не хапае: дзве сярэднія і адна гімназія. Планавалася іх узвесці ў населеных пунктах Ляскоўка і Копішча. Але ад апошняй адмовіліся.

Узводзіць жыллё ў Бараўлянах не плануецца. Тут ужо пражывае 30 тысяч чалавек, а ўсяго на тэрыторыі сельсавета ў 18 населеных пунктах — 45 тысяч. Далейшага прыросту не вытрымаюць інфраструктура і камунікацыі. Бараўляны ўжо сёння фактычна лічацца спальным раёнам, а ў перспектыве, хутчэй за ўсё, за імі гэты статус замацуецца афіцыйна. Разам з тым для тых, хто тут жыве, трэба ствараць камфортныя ўмовы — такая неабходнасць наспела даўно. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што ў пасёлку знаходзіцца шмат устаноў аховы здароўя, як раённага, так і абласнога, рэспубліканскага значэння. Штодня сюды прыязджаюць сотні наведвальнікаў. Многія на асабістых аўтамашынах. Дарогі ў пасёлку вузкія, часам цяжка размінуцца нават легкавушкам, катастрафічна не хапае паркавачных месцаў для транспарту. У населеным пункце ўжо прыступілі да рамонту цэнтральных вуліц і пад'язных дарог, якія пашыраць да чатырох палос. Каля Рэспубліканскага анкалагічнага цэнтра з'явіцца стаянка на 400 машын. Мяркуецца ўладкаваць аўтапаркоўкі і каля ўсіх бальніц, а ў перспектыве павялічыць колькасць машына-месцаў у кожным двары.

Намеснік старшыні Мінскага райвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы Уладзімір Юргевіч адзначае, што на дваровых тэрыторыях парадак наводзіцца з дапамогай саміх жыхароў. Яны ахвотна ідуць на кантакт з уладамі, у прыватнасці, на аснове долевага ўдзелу ўладкоўваюцца дзіцячыя пляцоўкі. Каб прывесці ў належны выгляд адзін двор, неабходна 200-300 млн рублёў. Цяпер рамантуюцца двары ў самых густанаселеных кварталах. Да восені мяркуецца добраўпарадкаваць яшчэ 15-20. З жыхарамі прыватнага сектара таксама праводзіцца адпаведная работа. Яны самі прыбіраюць прылеглую да сядзібы тэрыторыю, фарбуюць агароджы, фасады будынкаў, высаджваюць маладыя дрэўцы, газоны, разбіваюць клумбы.

**Бараўляны ўжо сёння фактычна лічацца спальным раёнам, а ў перспектыве, хутчэй за ўсё, за імі гэты статус замацуецца афіцыйна. Разам з тым для тых, хто тут жыве, трэба ствараць камфортныя ўмовы — такая неабходнасць наспела даўно.**

— Членам 35 жыллёвых кааператываў і таварыствам уласнікаў, якія не абслугоўваюцца ЖКГ, давядзецца весці рамонт за асабістыя сродкі, — заўважыла Ірына Савіцкая. — Акрамя таго, наводзіць парадак на сваёй тэрыторыі будуць і суб'екты гаспадарання, якіх налічваецца каля 50.

— Самае балючае пытанне для пасёлка — ліўневая каналізацыя. Пасля дажджу, веснавога разводдзя ўвесь бруд сцякае ў нізіну. Менавіта гэта стрымлівае дарожнікаў: спачатку трэба наладзіць «ліўнёўку», а потым ужо асфальтаваць вуліцу, каб не перарабляць усё нанова.

Але ў Бараўлянах ёсць аб'екты, якія варта браць за ўзор удумлівага падыходу да справы. Гэта Мінская абласная дзіцячая клінічная бальніца.

— Летась мы пачалі работы гаспадарчым спосабам, зрабілі цэнтральны ўваход, адрамантавалі палову кардыялагічнага аддзялення, замянілі вокны, дзверы, лінолеум, плітку, зрабілі новыя душавыя і туалеты. Усе работы абышліся нам у 439 млн рублёў. Да канца года плануем рамонт у пульманалагічным і прыёмна-дыягнастычным аддзяленнях, — адзначыў **галоўны ўрач Дзмітрый ЗАЙЦАЎ.** — Работы вядуць па грамадзянска-прававых дагаворах будаўнікі. А нашы супрацоўнікі выступаюць у ролі дызайнераў, падбіраюць фарбу, шпалеры, сантэхніку, каб усё гарманічна спалучалася, эстэтычна выглядала.

Наогул, як лічыць Дзмітрый Уладзіміравіч, працаваць гаспадарчым спосабам трэба ў камандзе, сумесна з загадчыкамі аддзяленняў, урачамі, медсёстрамі і санітаркамі. Гаспадарчы спосаб, на думку кіраўніка, дапамагае амаль удвая эканоміць грошы.

А што тычыцца сродкаў, то Мінскі аблвыканкам іх не шкадуе — выдзяляе ўстановам аховы здароўя, культуры, адукацыі на гэтыя мэты столькі, колькі яны могуць асвоіць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

**6 чэрвеня Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць чарговыя прамыя тэлефонныя лініі**

Прымаць «гарачыя» званкі ўлады пачалі са студзеня. Кожную суботу з 9.00 да 12.00 можна данесці сваю просьбу, пажаданне або прапанову. Кожны тыдзень на прамыя тэлефонныя лініі звяртаецца каля тысячы жыхароў краіны. Многія пытанні атрымліваецца вырашыць фактычна адразу. Чарговая традыцыйная сувязь будзе наладжана і ў гэтую суботу, 6 чэрвеня, з 9.00 да 12.00.

**НА ЗВАНКІ АДКАЖУЦЬ:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні Токар Мікалай Васільевіч — (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Дзіулін Анатоль Уладзіміравіч — (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Гарбачоў Уладзімір Уладзіміравіч — (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Агей Алена Аляксандраўна — (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Неўмяржыцкі Сяргей Пятровіч — (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні Малашка Валерый Анатольевіч — (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні Лапцеў Віктар Сяргеевіч (80172224444).

У Беларусі ў бягучым годзе арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

# Для беспрацоўных прадугледжаны грамадскія работы

**Сталічныя беспрацоўныя ў гэтым годзе будуць абавязаны ўдзельнічаць у аплачваемых грамадскіх работах 1-2 дні ў месяц. Адпаведнае рашэнне №1188 ад 7 мая 2015 года прыняў Мінгарвыканкам.**

У аплачваемых грамадскіх работах, акрамя людзей, якія маюць статус беспрацоўных, могуць прымаць удзел і незанятыя грамадзяне (пры жаданні), і работнікі, якія знаходзяцца ў вымушаных адпачынках па ініцыятыве наймальніка без захавання заработнай платы.

Для такіх катэгорый беспрацоўных, як інваліды, бацькі ў шматдзетных і няпоўных сем'ях, а таксама бацькі, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, моладзь да 18 гадоў, удзел у аплачваемых грамадскіх работах не з'яўляецца абавязковым.

— Калі ж чалавек, які мае статус беспрацоўнага, не будзе ўдзельнічаць у такіх работах без уважлівых прычын, можа быць прынята рашэнне аб прыпыненні выплаты яму дапамогі па беспрацоўі. Але чалавек пры гэтым застаецца зарэгістраваным у якасці беспрацоўнага, — патлумачыла «Звяздзе» **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама — начальнік упраўлення занятасці насельніцтва Таццяна КУДЗЕВІЧ.**

Яна таксама адзначыла, што, калі чалавек, які зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага, двойчы адмовіўся ад падыходзячай яму працы, ён здымаецца з уліку і, адпаведна, ужо не будзе з'яўляцца беспрацоўным.

**Святлана БУСЬКО.**



Фотаслова Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ПАБЫЦЬ у Лепелі і не ўбачыць Цмока — тое ж самае, што ў Парыжы не палюбавацца на Эйфелеву вежу. Нягледзячы на тое, што самога таямнічага Цмока ніхто наяве ніколі не назіраў. Але ж ёсць фантастычнае паданне пра жыхара Лепельскага возера (чытай Уладзіміра Караткевіча!). Ёсць скульптура падводнай істоты на маляўнічым беразе. Ёсць, нарэшце, выдатны турыстычны брэнд, які вабіць шукальнікаў прыгод наведаць гэты край.

Завітайце сюды, зрабіце на памяць фотаздымак, абдымаючы зусім не страшнага казачнага жыхара глыбінь і паразважайце пра яго лёс.

*Сем дзён і начэй наша лодка*
*па хвалях блукала,*
*Мы цмока шукалі,*
*а ён у глыбінях хаваўся.*
*Каманда скрывавіла рукі*
*і плыць не жадала,*
*І толькі адзін капітан веславаў,*
*не здаваўся.*

*Па цьмянай вадзе наша лодка*
*плыла адзінока,*
*Усюды шукаў капітан*
*крыважэрнага звера.*
*Ён ведаў сакрэт, што няма*
*ў гэтым возеры цмока,*
*Ды людзям чамусьці патрэбна*
*ў ворага вера...*

*Пад раніцу вернецца лодка.*
*Ад шчырага сэрца*
*На беразе будуць вітаць*
*«ўратаваныя» людзі,*
*І хтосьці знаёмы ў цярновым*
*вянку усміхнецца —*
*Маўляў, што ты зробіш,*
*такое бывала і будзе.*

# РЭГІСТРАЦЫЮ ПРАЙШЛІ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Такім чынам, сваё жаданне ўдзельнічаць у прыёмнай кампаніі афіцыйна афармілі сёлета 101 691 чалавек. Летась былі зарэгістраваны 105 692 ахвотныя. Дарэчы, пяць гадоў таму іх колькасць даходзіла да 173 тысяч.

Самай масавай дысцыплінай на ЦТ традыцыйна стала руская мова: яе плануюць здаваць больш як 77 тысяч чалавек. Беларускую мову выбралі толькі 24 тысячы абітурыентаў.

На фізіку зарэгістраваліся 28,7 тысячы чалавек. Тэст па матэматыцы будуць пісаць 52,2 тысячы чалавек. Заўважым, што летась экзамен па матэматыцы здавалі 65 тысяч абітурыентаў. Затое 23,3 тысячы прэтэндэнтаў на студэнцкі білет афармілі пропускі на англійскую мову (у 2014 годзе такіх было 19 тысяч). Напэўна, змяншэнне колькасці тых, хто здае матэматыку, і павелічэнне колькасці абітурыентаў, якія будуць здаваць замежную мову, сталі вынікам перагляду ўступных іспытаў на пэўных профілях падрыхтоўкі.

Пропускі на тэсціраванне па біялогіі афармілі крыху больш як 22,6 тысячы чалавек, на хімію — 12,2 тысячы, на гісторыю Беларусі — 17,3 тысячы, на грамадазнаўства — 10,7 тысячы, нямецкую мову — 3808, сусветную гісторыю — 1220, геаграфію — 1273. Самыя малакольказныя дысцыпліны — іспанская мова (185 чалавек), французская (788) і кітайская (10 чалавек). Пункт правядзення ЦТ па кітайскай мове будзе дзейнічаць у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце.

**Здараюцца і такія сітуацыі, калі ў працэсе праходжання тэста камусьці з абітурыентаў становіцца дрэнна. У кожным пункце тэсціравання дзяжураць медыцынскія работнікі, якія могуць засведчыць, што абітурыент сапраўды не можа працягваць работу.**

На ўсіх дысцыплінах колькасць абітурыентаў, якія будуць пісаць тэсты па-беларуску, вагаецца ад 1,3% (на грамадазнаўстве) да 11 працэнтаў (на гісторыі Беларусі).

Большасць абітурыентаў зарэгістраваліся на тры дысцыпліны на ЦТ — усяго было афармлена 275 948 пропускаў. Хоць для паступлення ў сярэдні спецыяльныя навучальныя ўстановы здаюцца толькі дзве дысцыпліны, правіламі не забараняецца рэгістравацца адразу на тры прадметы. Ёсць сярод абітурыентаў, якія будуць здаваць ЦТ, і замежныя грамадзяне — больш як 400 чалавек.

Многія ўжо сёння цікавяцца рэзервовым днём, хоць яшчэ ніхто не прапусціў экзамен. Арганізатары папярэджваюць, што здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну дысцыпліну і да здачы дапускаюцца толькі тыя абітурыенты, якія змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для таго, каб прапусціць экзамен.

Здараюцца і такія сітуацыі, калі ў працэсе праходжання тэста камусьці з абітурыентаў становіцца дрэнна. У кожным пункце тэсціравання дзяжураць медыцынскія работнікі, якія могуць засведчыць, што абітурыент сапраўды не можа працягваць работу над тэстам. У гэтым выпадку на пропуску пішацца «Тэсціраванне не прайшоў», у пратаколе арганізацыйнай камісіі робіцца адпаведны запіс і абітурыент атрымлівае права ўдзельнічаць у цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовы дзень (з гэтым жа пропускам і без дадатковай аплаты). Пры рэгістрацыі на рэзервовы дзень такі пропуск будзе падставай для допуску абітурыента на экзамен.

Перарэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень будзе весціся з 26 па 29 чэрвеня ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, Беларуска-Расійскім універсітэце і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

З сабой трэба мець пропуск на тэсціраванне, якое было прапушчана, дакумент, які сведчыць асобу абітурыента, і дакумент, што пацвердзіць уважлівую прычыну няяўкі. Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовы дзень (2 ліпеня) прызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**З 1 чэрвеня ў Міністэрстве адукацыі пачала працаваць «гарачая» лінія, на якой абітурыентаў і іх бацькоў гатовы пракансультаваць па пытаннях прыёму кампетэнтныя прадстаўнікі ВНУ.**

**Як канстатуюць у галоўным адукацыйным ведамстве, практыка запрашэння на «гарачую» лінію спецыялістаў вышэйшых навучальных устаноў выдатна сябе зарэкамендавала: яны не толькі добрыя тэарэтыкі, але і практыкі, якія могуць даць глыбокі і дэталёвы адказ на любое пытанне.**

**Тэлефанаваць на «гарачую» лінію можна па гарадскім нумары 222-43-12 да 16 жніўня, у тым ліку і па суботах: 6, 13, 20, 27 чэрвеня, 11, 18, 25 ліпеня, 1, 8 і 15 жніўня. Кансультанты працуюць з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 18.00.**

■ Па законах людскасці

## РАТАВАННЕ ХАТНІХ ГАДАВАНЦАЎ, або Спецаперацыя «Каты́»

**За выхадныя сталічным выратавальнікам давялося тройчы выязджаць на аказанне дапамогі братам нашым меншым. Ва ўсіх выпадках закладнікамі сітуацый былі каты.**

Першы выпадак адбыўся каля шасці гадзін вечара па вуліцы Грыбаедава. Гаспадар паведаміў, што жывёла ўцякла і забралася на дрэва. Праблема тут заключаецца ў тым, што ў большасці выпадкаў перапужаны кот пры набліжэнні выратавальнікаў ад страху скача ўніз і, калі не атрымлівае траўму, маланкай... узмывае на суседняе дрэва. І справа часта заканчваецца бессэнсоўнай беганінай, калі жывёлу ў выніку лепш пакінуць у спакоі, каб яна потым самастойна спусцілася з вышыні. Але гаспадар хатняга гадаванца запэўніў, што ён вельмі спакойны і не здольны на падобныя скачкі з прычыны сваёй баязлівасці. Выратавальнікі, якія вярталіся з заняткаў, вырашылі дапамагчы і паспяхова спусцілі ката на зямлю. Праз некалькі гадзін яшчэ адзін выпадак адбыўся на вуліцы Крапоткіна. Тут жывёлка захрасла ў радыятары ацяплення. Вызваляць яе давялося пры дапамозе спецінструмента. Пра трэцюю ахвяру выратавальнікам паведаміў мінак, які пачуў мяўканне з каналізацыі на вуліцы Гарадзецкай. Кацяня дасталі з калодзежа ліўневай каналізацыі.

Трэба сказаць, што ў прамыя функцыі МНС выратаванне жывёл не ўваходзіць. Такія сітуацыі разглядаюцца з пункту погляду людскасці: дыспетчар не мае права выслаць на здарэнне машыну. А вось калі ёсць законная магчымасць (калі выратавальнікі вяртаюцца з выкліку ці па ўласнай ініцыятыве), служба «101» заўсёды адгукаецца, асабліва ў сітуацыях, калі жывёла можа загінуць без староннняй дапамогі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## Смартфон — за смеласць

**Учынак, дастойны сапраўднага мужчыны, здзейсніў вучань другога класа сярэдняй школы №6 горада Слуцка Ягор Кур'ян.**

У адзін з майскіх дзён хлопчык вяртаўся са школы і ўбачыў, што дарослы чалавек напаў на знаёмую дзяўчынку і пацягнуў яе ў найбліжэйшую лесапасадку. Ягор не разгубіўся і пачаў клікаць на дапамогу. На яго крыкі прыбеглі двое работнікаў камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Слуцкая ЖКГ», якія злавілі зламысніка.

На святочнай лінейцы, прысвечанай заканчэнню навучальнага года, у прысутнасці сяброў і настаўнікаў часова выконваючы абавязкі начальніка раённага аддзела ўнутраных спраў падпалкоўнік міліцыі Уладзімір Герэга ўручыў хлопчыку смартфон ад імя супрацоўнікаў слуцкай міліцыі. Будуць заахвочаны і мужчыны, што затрымалі зламысніка.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «Прыйду ў любое надвор'е»

### «А Ў МЯНЕ ЦЯРПЕННЯ КРЫХУ БОЛЬШ...»

Я з гэтымі бабкамі — як са сваімі, — тлумачыць Ніна Аляксандраўна раніцай па дарозе да сваёй першай падапечнай. — Мне вельмі не хапае маіх бацькоў. Мама памерла ў 82 гады. Бацька быў удзельнікам вайны, інвалідам 2-й групы, пайшоў ад нас яшчэ раней, у 69 гадоў. Так што мне прыходзіць да гэтых людзей проста ў радасць. А ўжо як яны мяне чакаюць! Калі маецца быць мой візіт, апранаюцца, прычэсваюцца. А адна жанчына перад маім прыходам заўсёды падфарбоўвае вусны, бровы...

Сённяшні наш працоўны дзень пачынаецца з візіту да Людмілы Іванаўны. Дакладней, спачатку трэба зайсці ў краму па прадукты, а потым ужо — да яе. Людміле Іванаўне ў жніўні будзе толькі 55, як і яе сацработніку, але яна інвалід з дзяцінства: парок сэрца. Мужу 70 гадоў, ён інвалід першай групы, сваякі ўсе жывуць далёка...

— Вам вельмі пасуе ваша кашуля, — з парога робіць камплімент Ніна Аляксандраўна.

— Так, я люблю чырвоны колер, — ружавее ад задавальнення жанчына. Але ўжо праз паўхвіліны пачынае скардзіцца на здароўе, распавядае, як яе «хуткая» забірала ў бальніцу «пад кіслародам». Цяпер вось патрэбны лекі, а яны дарагія...

— Дык давайце напішам заяву на матэрыяльную дапамогу, — прапануе сацработнік, — я вам дапамагу скласці, як у мінулы раз...

— Людміла Іванаўна ў нас любіць музыку, я ёй купляю дыскі, — распавядае мне Ніна Аляксандраўна, калі мы выходзім з кватэры. — Выпісвае медыцынскія часопісы, чытае газеты, каб ведаць навіны. Ведае, дзе знаходзіцца ўчастковы, як дайсці да пракурора, увогуле — у крыўду сябе не дасць *(паўжартам)*. Вельмі любіць капусту з марынадам, кажа, што ад яе лягчэй зроку і лепш адчуваеш сябе...

У гэты час мы падыходзім да кіёска з агароднінай. «А вось капусты тут і няма, — мая спадарожніца трохі расчараваная. — Толькі ранняя, але яна дарагая зараз. Трэба ісці ў краму. Ячныя крупы яшчэ не забыцца купіць...

Да цяжкіх сумак ёй не прывыкаць: «Гэтымі днямі мае бабулі якраз пенсію атрымліваюць, таму заказаў шмат». А неўзабаве трэба будзе за кватэру ім плаціць. У паліклініцы сацработнік таксама часты госць: ва ўсіх яе падапечных маецца група інваліднасці, таму даводзіцца хадзіць па рэцэпты на лекі. Калі бабуля сама ідзе па рэцэпт, яна можа ўзяць яго ў памочніка ўрача. А калі сацработнік, тады трэба да ўчастковага тэрапеўта на прыём, а перад гэтым браць талончык. «Мне даводзіцца і на дом да сваіх падапечных выклікаць урача. Вядома, у кожнай з іх ёсць тэлефон, але ў рэгістратуру раніцай часам бывае складана датэлефанавацца, яны пачынаюць нервавацца. А ў мяне цярпення крыху больш...».

### «ТЭЛЕФАНУЕ МНЕ: АЛЯКСАНДРАЎНА, ДАПАМАГАЙ!»

Усё гэта Ніна Аляксандраўна расказвае па дарозе ўжо да іншай сваёй падапечнай. Вось і патрэбны нам дом. Набіраем у пад'ездзе дамафон.

— Бягу-бягу, — чуем голас.

— Штосьці я дрэнна сябе адчуваю сёння, — скардзіцца з парога 82-гадовая Рыма Мікалаеўна, — відаць, ужо канец хутка...



Трэба купіць капусты для падапечнай.

**КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА**

**Загадчыца аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва г. Баранавічы Таццяна СЯМЁНАВА:**

У нас у горадзе на сацабслугоўванні на даму знаходзяцца 556 гараджан, іх абслугоўваюць 65 сацыяльных работнікаў. У сярэднім на аднаго сацработніка прыпадае 8-9 падапечных. Колькасць пажылых людзей, якія маюць патрэбу ў сацабслугоўванні на даму, расце. Часцей за ўсё старыя тэлефануюць да нас самі, калі перастаюць спраўляцца з паўсядзённымі абавязкамі. Тэлефон наш гараджане ведаюць, мы пастаянна рэкламуем свае паслугі.

На сацыяльнае абслугоўванне мы бярэм толькі непрацаздольных грамадзян, г. зн. інвалідаў 1-й альбо 2-й групы (пры гэтым усё роўна, колькі ім гадоў) або пажылых людзей, якім споўнілася 60 гадоў і больш. Ва ўсіх іх павінна быць медыцынскае заключэнне аб тым, што яны маюць патрэбу ў сацабслугоўванні на даму.

Самая маладая наша падапечная — 38-гадовая жанчына, якая пакутуе на сіндром Даўна. Ёсць і 48-гадовы інвалід-калясачнік 1-й групы. Ён яшчэ ў маладосці няўдала нырнуў і атрымаў траўму шыі, пасля чаго яго паралізавала. Самыя пажылыя — чатыры чалавекі 1918 года нараджэння, якім ужо па 97 гадоў.

— Рыма Мікалаеўна, вось вам капуста, нармальнага памеру, як вы і прасілі. Паясце — адразу лягчэй стане!

— Угу, — недаверліва чмыхае бабуля. Але тут жа ажыўляецца: — Распранайцеся, дзяўчаткі! Зараз кавы пап'ём.

— З практыкі відаць, што паступова з гэтым чалавекам усё ж такі дамаўляюцца. Аднак сітуацыя залежыць ад таго, ці прыватызаваны дом. Калі дом прыватызаваны, то рашэнне аб высяленні прымаецца толькі праз суд. А калі гэта дзяржаўны дом, то патрэбна рашэнне выканкама. З прыватнага дома ніхто вас так проста не выселіць. Гэтая жанчына правільна кажа: летась кошт быў адзін (каля 1800 долараў за кв.м), а сёння іншы (1300-1400). Але ёсць яшчэ адна значная абставіна — усёй зямлёю ў Мінску валодае Мінгарвыканкам. Таму, калі гораду спатрэбіцца зямля, на якой стаіць ваш дом, вы вымушаны будзеце згадзіцца на пераезд у іншае жыллё ці на грашовую кампенсацыю.

## ІНТЭРНАТЫ НЕ ПРЫВАТЫЗУЮЦЬ

**Алена Коршун, г. Брэст:**

***— Я 13 гадоў пражыла ў сямейным інтэрнаце. У нас ёсць дзіця. Зрабілі добры рамонт. Аднак інтэрнат ведамасны. Ці магу я свой пакой прыватызаваць і прадаць ці хаця б атрымаць грошы за рамонт? Мы зараз будуем кватэру па чарзе.***

— Пакоі ў інтэрнатах, згодна з артыкулам 119 Жыллёвага кодэкса, не падлягаюць прыватызацыі, абмену, падзелу і здачы па дагаворы паднайму. Службовае жыллё можна прыватызаваць, а вось інтэрнаты нельга. І за рамонт таксама грошы наўрад ці вернуць.

***— Можа быць, з часам гэтыя ведамасныя інтэрнаты перавядуць у камунальную ўласнасць і тады іх можна будзе прыватызаваць?***

— Я пакуль што пра такое не чуў нічога. Гэта кампетэнцыя Савета Міністраў і адпаведных органаў.

**Андрэй Маёраў, г. Мінск:**

***— Ці магчыма трохпакаёвую кватэру ў сталіцы (вул. Русіянава, панэльны дом) сёння прадаць і купіць узамен дзве аднапакаёвыя? Калі магчыма, то якія гэта будуць кватэры?***

— У Першамайскім раёне дзве аднапакаёўкі не атрымаецца купіць. Будзе патрэбна даплата каля 5-10 тысяч долараў. Можа быць, у Заводскім раёне знойдзеце не надта добрыя кватэры і без даплаты.

**Уладзімір Бяганскі, г. Мінск:**

***— Я збіраюся прадаваць сваю кватэру і хачу звярнуцца ў агенцтва нерухомасці. Зразумела, што паслуга платная. Мне цікава, ці залежыць кошт паслугі ад цаны кватэры, хто павінен плаціць — пакупнік ці прадавец, ці абмежаваны максімальныя і мінімальныя цэны на паслугі агенцтва. А таксама ці прадугледжаны льготы для шматдзетных, пенсіянераў ці інвалідаў?***

— Аплата паслуг агенцтва нерухомасці рэгулюецца Пастановай Савета Міністраў № 957 ад 20 ліпеня 2009 года. Тарыфы на рыэлтарскія паслугі выражаюцца ў працэнтных адносінах у залежнасці ад кошту кватэры. Максімальная камісія — 3%. Мінімальная — 1%. Чым больш каштуе кватэра, тым меншы працэнт выплачваецца за паслугі. Гэтыя паслугі аплачвае прадавец. Пакупнік аплачвае іншыя паслугі — яны звязаны з рэгістрацыяй, афармленнем дакументаў і гэтак далей. Тут прымяняюцца фіксаваныя стаўкі на рыэлтарскія паслугі. Ільготы прадастаўляюцца шматдзетным сем'ям. Для гэтай катэгорыі грамадзян прадугледжана зніжка ў 50%.

***— А колькі будзе каштаваць продаж кватэры з цаной 50 тысяч долараў?***

— Спачатку трэба падлічыць, колькі гэта будзе базавых велічынь. Напрыклад, 3% бяруцца з кватэры коштам да 4200 базавых, ад 4200 да 5000 базавых — 2,5% і гэтак далей. З вашай кватэрай атрымліваецца прыкладна 3978 базавых. Значыць, вы павінны заплаціць 3% ад кошту кватэры, а гэта эквівалент 1500 доларам. І калі ваша сям'я шматдзетная, то вы атрымаеце зніжку ў памеры, эквівалентным 750 доларам.

***— Яшчэ я чуў, што гэтыя плацяжы цяпер ажыццяўляюцца толькі праз банк...***

— Не, гэта няпраўда. У кожным агенцтве нерухомасці ёсць касавы апарат і можна ўносіць наяўныя сродкі. Галоўны бухгалтар выдае чэк на гэтую суму.

***— А вось калі я (фізічная асоба) прадаю камусьці (таксама фізічная асоба) сваю кватэру, то як ён са мною будзе разлічвацца?***

— Заканадаўча не забаронена разлічвацца гатоўкай. У дагаворы будзе ўказана, што разлік ажыццёўлены паміж пакупніком і прадаўцом ці да здзелкі, ці падчас здзелкі, ці пасля здзелкі. Толькі валютай разліку павінны быць беларускія рублі.

## СУМНІЎНУЮ ЗДЗЕЛКУ ПРАВЕРАЦЬ АБАВЯЗКОВА

**Аксана Ваніш, г. Мінск:**

***— Я хачу купіць кватэру ў Фрунзенскім раёне. Яна мне падабаецца, але мяне насцярожвае, што там за 7 месяцаў змяніліся тры ўласнікі. Я баюся, што могуць узнікнуць праблемы. Цана занадта прывабная — усяго 1000 долараў за кв. метр. Ці ёсць нейкія гарантыі? Ці будзе адказваць агенцтва нерухомасці за незаконную здзелку?***

— Кожная здзелка, якая ажыццяўляецца ў агенцтве нерухомасці, застрахавана. Пры ўзнікненні страхавога выпадку адбываецца кампенсацыя пацярпеламу боку. Ваш дагавор з агенцтвам — гэта ваша гарантыя.

***— А па якіх крытэрыях увогуле выбраць добрае агенцтва?***

— Варта паглядзець на тое, колькі гадоў на рынку яно працуе. Але ўся дзейнасць ліцэнзуецца. Гэта значыць, што любое агенцтва нерухомасці, якое мае ліцэнзію, акажа адпаведную юрыдычную паслугу. Наколькі гэта будзе прафесійна — іншае пытанне. Можна пашукаць водгукі на дзейнасць агенцтва ў інтэрнэце.

**Ірына Пабягайла, г. Мінск:**

***— Прыкладна год таму ішлі размовы аб тым, што здачу кватэр на суткі забароняць альбо павысяць падаткі на такую дзейнасць. Што сёння пра гэта чуваць? Ці будуць нейкія змены?***

— Змены ўжо адбыліся. Па дзейным заканадаўстве, да прадпрымальніцкай дзейнасці, у прыватнасці, не адносіцца дзейнасць па здачы ўнаём (паднаём) жылых памяшканняў, акрамя прадастаўлення месцаў для кароткатэрміновага пражывання. Таму, калі вы здаеце кватэру на суткі, то гэта прыраўноўваецца да прадпрымальніцкай дзейнасці, і вы павінны зарэгістравацца як прадпрымальнік у мясцовым выканкаме і падатковай інспекцыі.

**Кар. «Звязды»:**

**— Наколькі я памятаю, асабліва актыўныя спрэчкі па здачы кватэр на суткі былі летась перад чэмпіянатам свету па хакеі. Тады казалі, што гэтыя кватэры складаюць занадта вялікую канкурэнцыю гасцініцам.**

— Канкурэнцыя насамрэч сур'ёзная. Цана напалову меншая, таму замежнікам больш цікава зняць кватэру.

## НАМ НЕ СТРАШНЫ МАРАТОРЫЙ

**Екацярына Смірнова, г. Мінск:**

***— Мы пабудавалі кватэру па льготным крэдыце. Калі мы цяпер яго датэрмінова пагасім, ці магчыма будзе прадаць кватэру і па якой цане?***

— Калі вы пагасілі крэдыт, то прадаць кватэру можна будзе толькі праз 5 гадоў пасля пагашэння. Да гэтага тэрміну пераважнае права мае гарвыканкам. Калі ён не выкупляе, то вы не можаце прадаць іншай асобе. А цану вы прапануеце самі. Аднак ніводнага прэцэдэнта, калі б выканкам выкупляў кватэры, яшчэ не было.

Нагадаю, што ў адпаведнасці з нормамі указаў Прэзідэнта №13 ад 6 студзеня 2012 года і №246 ад 30 мая 2013 года, продаж жылых памяшканняў, іх частак (калі ажыццёўлены падзел жылога памяшкання), а таксама доляў у праве ўласнасці на гэтыя жылыя памяшканні, пабудаваныя (рэканструяваныя) або набытыя з прыцягненнем ільготнага крэдыту, не дапускаецца да яго поўнага пагашэння. Потым, на працягу пяці гадоў з даты датэрміновага пагашэння гэтага крэдыту, продаж можа ажыццяўляцца адпаведнаму раённаму, гарадскому выканаўчаму і распарадчаму органу, мясцовай адміністрацыі ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

Пры адмове мясцовых улад купіць гэтае жыллё продаж, дарэнне альбо абмен названага жылога памяшкання (яго частак, доляў у праве ўласнасці) на працягу пяці гадоў з дня датэрміновага пагашэння крэдыту ажыццяўляецца з дазволу гэтага выканаўчага і распарадчага органа ў выключных выпадках (пераезд у іншую мясцовасць, скасаванне шлюбу, смерць уласніка жылля і г. д.) або ў выпадку паляпшэння жыллёвых умоў уласнікам жылля шляхам будаўніцтва, рэканструкцыі або набыцця жылога памяшкання.


Такую «цукерачку» некаторыя могуць купіць на раз-два.

**— А здаваць у наём можна такую кватэру, калі крэдыт пагашаны?**

— Здаваць можна, але пры афармленні дакументаў у ЖЭСе трэба будзе паказаць даведку з банка аб тым, што крэдыт пагашаны.

## ГОЛАЯ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ ТАННЕЙШАЯ

**Вольга Трысцень, г. Мінск:**

***— Я прапісана ў Баранавічах, а жыву і працую ў Мінску. Маю зберажэнні каля 20 тысяч долараў. Заробак у мяне складае 10 мільёнаў. Што лепей зараз: купляць гатовае жыллё ці будавацца? Ці магчыма атрымаць крэдыт без прапіскі ў Мінску?***

— Вялікі крэдыт з такім заробкам не дадуць. Тым больш абавязкова трэба тут зарэгістравацца, калі хочаце ў чаргу станавіцца. Па камерцыйным долевым будаўніцтве можна самой паспрабаваць.

> **«Ёсць яшчэ адна цікавая тэндэнцыя: многія прадаўцы глядзяць кошт кватэр у газеце, а трэба глядзець цану здзелкі. Напрыклад, сярэдняя цана прапановы ў красавіку складала 1653 долары за кв. метр, а сярэдні кошт здзелкі — 1359 долараў за кв. метр. Розніца ў 300 долараў».**

***— А што наконт растэрміноўкі, якую сёння прапануюць многія забудоўшчыкі?***

— Таксама нядрэнны варыянт. Выплачваецца ад 30% да 50% ад агульнага кошту першым плацяжом, а потым штомесяц трэба аддаваць роўнымі долямі. Але гэтыя долі таксама немаленькія. Мне здаецца, што купляць гатовае жыллё больш надзейна. Новыя кватэры сёння часцей за ўсё здаюцца без адстройвання — нават без сцяжкі на падлозе бываюць. Я ўжо не кажу пра міжпакаёвыя дзверы і астатняе. Каб давесці такую «голую» кватэру да розуму, спатрэбіцца шмат дадатковых грошай і часу.

**— Можа быць, тады лепей набыць пакой?**

— Гэта правільнае рашэнне. Пакоі каштуюць роўна столькі, колькі ў вас ёсць грошай — 19-20 тысяч долараў.

**— А ці змагу я потым гэты пакой прадаць?**

— Безумоўна. Пакоі вельмі актыўна прадаюцца і купляюцца, бо больш людзей, якія маюць грошы на пакой, чым на цэлую кватэру.

## ТАК ПРОСТА НЕ ВЫГАНІШ

**Екацярына Таранда, г. Мінск:**

***— Я развялася з мужам. Двое дзяцей — 4,5 і 7 гадоў. Ёсць кватэра, пабудаваная па льготным крэдыце для маладой сям'і. Крэдыт і будаўніцтва афармлены на мяне. Ці магу я неяк выселіць мужа з кватэры? Ён ужо больш за тры месяцы з намі не жыве.***

— Выселіць ніяк не атрымаецца. Паколькі вы былі ў шлюбе, калі пачалі будаваць кватэру, уся ваша маёмасць, згодна з артыкулам 259 Грамадзянскага кодэкса, належыць вам абаім. І не мае значэння, што ў вас тытульнае права ўласнасці, што на вас афармлены ўсе дакументы. І няма ніякай розніцы, што ён там не жыве. Згодна з артыкулам 85 Жыллёвага кодэкса, магчымасць высялення можа быць толькі ў выпадку вядзення вашым былым мужам асацыяльнага ладу жыцця, псавання жылога памяшкання ці выкарыстання яго не па прызначэнні.

**Аляксандр Мікалаевіч, г. Маладзечна:**

***— Маю ва ўласнасці двухпакаёвую кватэру, якую набыў да шлюбу. Ёсць былая жонка і дачка. Яны там прапісаны. Сам я з імі не жыву. Хачу прадаць гэту кватэру і купіць аднапакаёвую сабе, а астатнія грошы аддаць дачцэ. Ці магу я гэта зрабіць?***

— Згодна з артыкулам 95 Жыллёвага кодэкса, на высяленне па патрабаванні ўласніка жылога памяшкання ў іншае жылое памяшканне паўналетніх членаў, былых членаў сям'і ўласніка, іншых грамадзян, якія маюць права на валоданне і карыстанне жылым памяшканнем і пражываюць сумесна з ім, не маючы долі ў праве агульнай уласнасці на гэта жылое памяшканне, з іх непаўналетнімі дзецьмі, прызнанымі тымі, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным стане ці мае патрэбу ў дзяржаўнай абароне, неабходна згода органаў апекі і папячыцельства.

Асобна нагадаю, што, згодна з артыкулам 85 Жыллёвага кодэкса Беларусі, падлягае высяленню ў судовым парадку без прадастаўлення іншага жылога памяшкання па патрабаванні ўласніка жылля або іншых зацікаўленых асоб пэўная катэгорыя жыхароў. У прыватнасці, да іх адносяцца паўналетнія члены, былыя члены сям'і ўласніка, якія на працягу года тры і больш разоў прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў, што прывяло да разбурэння ці псавання жылога памяшкання, альбо пры выкарыстанні яго не па прызначэнні.

Высяленне пагражае і за такія парушэнні патрабаванняў гэтага кодэкса, якія робяць немагчымым для іншых жыхароў сумеснае пражыванне ў адной кватэры. Трэба адзначыць, што такая крайняя мера выкарыстоўваецца судом пры ўмове, калі нядбайныя жыхары былі папярэджаны ўласнікам аб магчымасці высялення без прадастаўлення іншага жылога памяшкання і на працягу года пасля такога папярэджання прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічныя правапарушэнні.

Таксама былыя члены сям'і ўласніка жылога памяшкання, іншыя грамадзяне, якія маюць права валодання і карыстання жылым памяшканнем і не маюць долі ў праве агульнай уласнасці на гэтае жылое памяшканне, падлягаюць высяленню з яго па патрабаванні ўласніка жылога памяшкання без прадастаўлення іншага жылога памяшкання, калі іншае не ўстаноўлена шлюбным дагаворам або пісьмовым пагадненнем аб парадку карыстання жылым памяшканнем.

Таксама Жыллёвы кодэкс тлумачыць, што паўналетнія члены сям'і ўласніка кватэры, якія пражываюць сумесна з ім і якія не маюць долі ў праве агульнай уласнасці на гэта жылое памяшканне, падлягаюць высяленню па патрабаванні ўласніка ў іншае жылое памяшканне, якое належыць ім альбо ўласніку на праве ўласнасці ў гэтым населеным пункце і адпавядае санітарным і тэхнічным патрабаванням для пражывання.

Нават былых паўналетніх членаў сям'і ўласніка кватэры, якая пабудавана з дзяржаўнай падтрымкай, выселіць з такой кватэры нельга, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 85 кодэкса.


Бывае, што дача — не толькі адпачынак, але і праблема.

## «КАВАЛАЧАК» ДАЧЫ ПРАДАЦЬ ПРАБЛЕМАТЫЧНА

**Аляксей Саўчанка, г. Мінск:**

***— Нядаўна памёрлі бацькі. Ад іх засталася дача. Ёсць брат, жыць з якім на гэтай дачы разам не атрымліваецца, бо нашы жонкі не ладзяць. Таму брат туды ездзіць з сям'ёй, а мы хочам прадаць сваю частку. Як прымусіць брата да продажу ўсёй дачы (бо выкупляць маю частку ён не хоча)?***

— У продажы вашай часткі няма ніякіх праблем, калі дача прыватная. Але прымусіць брата выкупіць вашу частку або прадаць сваю ніхто не можа. У той жа час і прадаць некаму чужому палову дома вельмі складана. У будучыні пакупніку часткі дачы можа спатрэбіцца судовае рашэнне аб вызначэнні парадку карыстання дачай. Трэба спрабаваць дамаўляцца з братам.

**Кар. «Звязды»:**

**— А ці бывалі ў вашай практыцы такія выпадкі, калі насамрэч удавалася прадаць палову дачы?**

## НІША ПРОДАЖУ НЕ ПЕРАШКОДА

**Іван Змітрук, г. Мінск:**

***— У мяне ёсць аднапакаёвая кватэра, і я збіраюся яе прадаць. Але баюся праблем з-за таго, што ў свой час зрабіў там нішу пад халадзільнік і аб'яднаў ванную з прыбіральняй. Ці насамрэч могуць быць цяжкасці пры продажы? Хто звяртае ўвагу на такія самавольныя змяненні кватэры?***

— Раней было абавязковае абследаванне кватэры супрацоўнікамі БТІ кожныя пяць гадоў. Сёння гэтага ўжо няма. Нават калі вы зрабілі перапланіроўку, ніхто не зможа перашкаджаць вам у продажы раз пакупніка гэта задавальняе. Аднак гэта не значыць, што ў будучыні ў сувязі з выяўленнем парушэнняў, звязаных з перапланіроўкай, новы ўласнік не будзе прыцягнуты да адказнасці.

***— А калі пакупнік не згодны?***

— Шукайце іншага пакупніка.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Сяргей КУРКАЧ.**

# Краіна здароўя

Выпуск № 10 (340)

■ Будзем ведаць

## ДЗЕ МОЖНА КУПЛЯЦЬ ЛЕКІ?

Толькі ў аптэках. Калі аптэкі ў нейкіх сельскіх населеных пунктах адсутнічаюць, рознічную рэалізацыю лекавых сродкаў можа ажыццяўляць і медыцынскі работнік дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя або яе падраздзялення. Аднак Законам «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб лекавых сродках» (уступіў у сілу 21 мая гэтага года) прадугледжаны яшчэ і рознічны гандаль лекамі ў месцах правядзення міжнародных або рэспубліканскіх тэматычных выстаў, спартыўных і культурна-масавых мерапрыемстваў. Што да інтэрнэт-гандлю, то там, як і раней, можна набываць толькі тое, што лекамі не з'яўляецца — біялагічна актыўныя дабаўкі, напрыклад.

■ Псіхалогія для ўсіх

## ОЙ, ЭКЗАМЕНУ БАЮСЯ!

**Хто з нас не ведае, што такое «перадэкзаменацыйны мандраж»? Ёсць некалькі відаў такіх страхаў. Што за яны і як з імі быць, тлумачыць загадчыца псіхалагічнай лабараторыі Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Таццяна УШАКЕВІЧ.**



**Страх 1. Выцягну «дрэнны» білет.**

Ёсць людзі, якія вучаць усе білеты. Веды ў такіх людзей практычна выдатныя, але яны часта становяцца ахвярамі думкі, што аднойчы выцягнуць пытанне, на якое не змогуць нічога адказаць.

Такія паводзіны характэрныя для педантаў, якія прывыклі ўсё рабіць на «выдатна», і за гэтай педантычнасцю хаваецца няўпэўненасць у сабе. І колькі б намаганняў ні рабілі, вынік здаецца недастатковым.

ПАРАДА. Паверыць у сябе. Зрабіце глыбокі ўдых і... на лёгкім дыханні пачынайце адказваць. Той, хто рыхтуецца да экзамену, усё ж такі валодае інфармацыяй і заўсёды можа калі не паўтарыць слова ў слова, то хаця б паразважаць. Часта выкладчыкі чакаюць не так многа, як падаецца.

**Страх 2. Аслупянею перад выкладчыкам.**

Рукі-ногі-язык у некаторых аднімаецца пад пільным позіркам выкладчыка. Гэта інстынктыўная рэакцыя, яшчэ з дзяцінства многія прывыклі так рэагаваць на тых, ад каго залежаць. Аднак ужо трэба вызначыцца — вы дзіця ці дарослы? Калі дарослы, значыць, можаце адчуваць сябе з выкладчыкам на роўных.

ПАРАДА. Сканцэнтруйцеся не на выкладчыку, а на адказе. Адказвайце нібы для сябе.

**Страх 3. Не буду ведаць, што рабіць.**

Кніжкі прачытаныя, канспект ведаеш на зубок, а ў думках упарта пракручваюцца дурныя сітуацыі: то білет перацягваеш, то нешта раптоўна здараецца. Сам механізм «пракручвання» сітуацыі ў думках не такі ўжо і дрэнны. Тое, што мы ажыццявілі ў галаве, прасцей ажыццявіць на справе.

ПАРАДА. Сканцэнтруйцеся на тых спосабах выйсця з сітуацыі, што круцяцца ў галаве, прыдумайце што-небудзь камічнае. Смех здымае напружанне. Не думайце аб тым, як будзе страшна, думайце, на што вы здольныя, каб прыгожа і з гумарам выйсці з сітуацыі, калі давялося «плаваць».

**Страх 4. Патрачу лішнія хвіліны.**

Многія адкладваюць самыя важныя пытанні на апошні дзень, таму не абыходзіцца без валяр'янкі і бяссоннай ночы.

ПАРАДА. Хвалявацца не трэба. Арганізм кожнага чалавека мае свой рытм, і для некаторых сапраўды цяжка прымусіць сябе шмат дзён сядзець за кніжкамі. У стрэсавай сітуацыі арганізм мабілізуецца, і праціўнікі размеранага рытму падрыхтоўкі могуць з поспехам запомніць матэрыял, прачытаны ў апошні вечар.

**Страх 5. Нічога не ўспомню.**

Вывучаныя фармулёўкі, законы, азначэнні зліваюцца ў нейкую масу ведаў, адкуль, здаецца, ужо нічога не дастанеш. А раптам на экзамене нічога не ўспомніш?

ПАРАДА. Каша ў галаве — сімптом высокага ўзроўню трывогі. Таму важна супакоіцца, а не імкнуцца зрабіць гэту кашу яшчэ больш канцэнтраванай, зноў і зноў гартаючы падручнік. У стане напружання запамінанне неэфектыўнае.

**Страх 6. Не атрымаю «10».**

Вобраз жаданай адзнакі пастаянна маячыць на гарызонце. Гэта перашкаджае падрыхтоўцы, паколькі заўсёды думаеш, ці дастаткова ты ўжо ведаеш для гэтага бала. Сюды ж дадаецца страх не атрымаць жаданае і незадаволенасць сабой у выніку, напрыклад, «васьмёркі». Зноў жа, залішне перфекцыянізму. У творчым парыве атрымліваюцца лепшыя вынікі, чым пасля планамернай і педантычнай падрыхтоўкі, хоць і пра яе забывацца не варта. Імкненне ўсё рабіць на «выдатна» рана ці позна прыводзіць да неўратызацыі.

ПАРАДА. Дазвольце сабе быць недасканалым, прайграваць. Хутчэй за ўсё, менавіта так вы атрымаеце «дзясятку».

**Страх 7. Не засну.**

Нават перад лёгкім іспытам можа прыходзіць стан трывогі праспаць яго. Поўная мабілізацыя сапраўды часам пазбаўляе сну.

ПАРАДА. Ёсць шмат методык рэлаксацыі, хоць іх не засвоіш адразу. Добрай альтэрнатывай можа стаць паход у трэнажорную залу, на ўрок танцаў, прагулка па вуліцы. А таксама неабходна навучыцца пераключаць увагу.

**Страх 8. Памру ад голаду.**

Ад хвалявання можа прапасці апетыт, нават смачныя стравы становяцца нясмачнымі. Дрэннае самаадчуванне — вынік нашага псіхалагічнага стану.

ПАРАДА. Наўрад ці зусім немагчыма прымусіць сябе з'есці хоць што-небудзь — каб хоць дайсці да экзаменацыйнага кабінета.

**Страх 9. Буду найгоршым.**

Здаецца, усе здадуць, а ты — не. І тыдзень падрыхтоўкі не дадае ўпэўненасці ва ўласных сілах.

ПАРАДА. Не трэба сябе ні з кім параўноўваць. Для некага ўся перачытаная энцыклапедыя — не мяжа ў ведах, а для вас прачытаны падручнік — ужо дасягненне.

**Страх 10. Не паспею.**

Аб'ём пытанняў настолькі велізарны, што ніяк нельга адмежавацца ад думкі: я катастрафічна не паспяваю. Каб мець уяўленне аб матэрыяле, дастаткова адзін раз яго прачытаць. Многія чытаюць па дзесяць разоў, нервуюцца і мала што запамінаюць.

ПАРАДА. Не думайце пра тое, колькі працэнтаў вывучылі. Проста працягвайце азнаямленне з матэрыялам.

### ЯК СКАНЦЭНТРАВАЦЬ УВАГУ?

✓ Запланауйце час так, каб нішто не адцягвала ўвагу ад заняткаў (ні візіты сяброў, ні тэлефонныя званкі).

✓ Арганізуйце працоўнае месца.

✓ Праглядзіце матэрыял, складзіце план сваёй работы. Пішыце шпаргалкі — гэта дапамагае вызначыць сутнасць.

✓ Перад новай тэмай праглядзіце папярэдні раздзел. Калі штосьці вам не знаёма наогул, ліквідуйце прабел.

✓ Пачытайце штосьці з матэрыялу ўголас, калі адчуваеце, што трывога і блытаныя думкі пачалі перашкаджаць вам. Можна зрабіць перапынак хвілін на 15.

✓ Чытайце так, каб глыбока асэнсоўваць. Аднак не празмерна павольна — гэта адцягвае ўвагу.

✓ Чытайце і пераказвайце, шукайце прыклады. Абмеркаванне з кім-небудзь будзе толькі на карысць.

✓ Калі штосьці адцягнула вашу ўвагу, перадыхніце хвілінку і... зноў за справу.

✓ Вярніцеся на тое месца, на якім «адключыліся».

✓ Вас не павінны напружваць асвятленне, тэмпература паветра. Падчас рэгулярных перапынкаў рабіце простыя гімнастычныя практыкаванні.

■ Бяспека пражывання

## РАДОН У ДОМЕ

**Граніт, сілікатная цэгла, бетон, сілікатны шлак, фосфагіпс, пясок, гравій, якія выкарыстоўваюцца для будаўніцтва жылля, заўсёды змяшчаюць спалучэнні ўрану і торыю. Распадаючыся, яны ўтвараюць радыеактыўныя газы — радон і тарон, здольныя назапашвацца ў памяшканнях. Радон і тарон пранікаюць таксама з зямлі праз трэшчыны ў фундаменце, падлозе, сценах, праз адтуліны каналізацыі і водаправода. Газы пры гэтым не маюць ні паху, ні колеру, а таму выяўляцца могуць толькі спецыяльнымі прыборамі.**

— Калі ў доме адсутнічае спецыяльная скразная выцяжка, якая выводзіць паветра з-пад падлогі праз дах, то насычанае радонам і таронам грунтовае паветра канцэнтруецца ў пакоях, — паведамляе **ўрач-гігіеніст аддзялення радыяцыйнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Васіль ПІНЧУК**. — Калі дом стаіць на грунце, багатым на радыеактыўныя элементы, то сітуацыя асабліва небяспечная...

Дадатковыя крыніцы паступлення радону ў жыллё — вада і прыродны газ. У глыбокіх калодзежах і артэзіянскіх свідравінах ён можа быць у вялікай канцэнтрацыі. У гэтым сэнсе больш небяспечнымі ў параўнанні з жылымі памяшканнямі будуць ванныя пакоі. Радон пад зямлёй пранікае і ў прыродны газ, а таму яго прысутнасць у кватэры можа вырасці, калі кухонныя пліты, у якіх спальваецца прыродны газ, працуюць без выцяжкі.

Рэгулярнае праветрыванне кватэры, дому, дачы (асабліва калі яна ўсю зіму была зачынена), гаража, сутарэнняў можа знізіць канцэнтрацыю радону і тарону ў некалькі разоў.

▸ **У дамах і кватэрах павінна быць добрая вентыляцыя.**

▸ **Не варта падоўгу знаходзіцца ў падвальных памяшканнях.**

▸ **Пры выяўленні павышанай канцэнтрацыі радону рэкамендуюць загерметызаваць трэшчыны ў сценах, падлозе; перакрыць рух паветра з падвала; пакрыць сцены і падлогу эмульсійнымі або масляннымі фарбамі, шпалерамі.**

Падчас праектавання новых будынкаў жыллёвага і грамадскага прызначэння ўлічваецца сярэднегадавая актыўнасць прадуктаў радону і тарону ў паветры памяшканняў, магутнасць доз гама-выпраменьвання. Пры высокіх значэннях праводзяцца абарончыя мерапрыемствы (паляпшэнне вентыляцыі і інш.).

Аб наяўнасці кантролю радыеактыўнасці прыродных радыенуклідаў у будматэрыялах павінны сведчыць адпаведныя дакументы.

— Радыяцыйны кантроль за будаўнічымі і апрацоўчымі матэрыяламі паказвае, што асноўная іх маса бяспечная, — дадае Васіль Аляксеевіч. — У першую чаргу гэта пясок, цэмент, цэгла, мармур. Аднак трапляюцца і такія маркі будматэрыялаў, якія змяшчаюць радыенукліды. У асноўным гэта граніты і шчэбень. Іх нельга выкарыстоўваць у будаўніцтве жылых памяшканняў, для рамонту і адстройвання. Калі ёсць неабходнасць пераканацца ў бяспецы жылля на прадмет радону, можна звярнуцца ў цэнтры гігіены і эпідэміялогіі вашага горада або раёна. Спецыялісты гэтых службаў правядуць замеры непасрэдна на месцы.



■ Асаблівасці захворвання

## ПРА СТРАЎНІК І ЯГО ВОРАГАЎ

**Страўнік — не сэрца, без яго можна жыць. Гэты орган часам выдаляюць або «ўшываюць», але чалавек працягвае жыць, хоць гэта няўхільна адбіваецца на якасці яго жыцця. Бо лішніх органаў у нас няма, усё прадумана. Для чаго ж патрэбен орган, падобны на зручны мех? Як захаваць яго здаровым, без эрозій ды язваў? Паспрабуем разабрацца разам з дацэнтамі 2-й кафедры ўнутраных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдатамі медыцынскіх навук, урачамі-гастраэнтэролагамі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалаем КАПРАЛАВЫМ і Ірынай ШАЛАМІЦКАЙ.**

### ШТО ТАМ АДБЫВАЕЦЦА?

— Наогул страўнік ажыццяўляе асноўны этап пераптраўлівання ежы. Нездарма яна знаходзіцца тут цягам некалькіх гадзін. Не затрымліваецца толькі вада — праходзіць далей транзітам. Сок, малако, кефір пераптраўліваюцца, як і цвёрдыя прадукты, таму і лічацца ежай. Проста сок пераптраўліваецца хутка, рыба крыху даўжэй, а мяса — яшчэ даўжэй. Тут нават не патрэбна спецыяльная адукацыя, каб гэта зразумець. Любая ежа пакідае страўнік і рухаецца далей, у дванаццаціперсную кішку, у выглядзе вадкай кашкі, яна называецца хімусам.

Сценкі страўніка маюць шмат залоз, якія пачынаюць сваю работу пад уздзеяннем некалькіх момантаў, у тым ліку механічнага ціску і хімічнага ўздзеяння. Што такое хімічнае ўздзеянне? Мы бачым ежу, адчуваем яе пах, у нас ужо актывізуюцца гэтыя залозы і пачынаецца выпрацоўка трох важных гармонаў — гастрыну, ацэтылхаліну і гістаміну, без якіх немагчымы працэс пераптраўлівання. Запускаецца адначасова і працэс аддзялення страўнікавага соку. Сценкі страўніка аўтаматычна скарачаюцца, ежа насычаецца гэтым сокам. Як толькі ежа стала хімусам, яна павінна перайсці ў тонкі кішэчнік — дванаццаціперсную кішку, для чаго прымушае адкрыцца сфінктар, які аддзяляе страўнік ад кішкі. Сфінктар — вельмі важны пагранічнік, паколькі асяроддзе ў страўніку кіслае, а ў тонкім кішэчніку — шчолачнае. Калі сфінктар расслаблены, ежа можа закідвацца з кішэчніка ў страўнік і спрыяць гастрыту і язве. Ежа павінна рухацца строга ўніз, а калі адбываецца закід угору, то гэта называецца рэфлюксам, і гэта ўжо само па сабе захворванне, якое можа спрыяць развіццю больш небяспечнай паталогіі.

### ЯКУЮ ЕЖУ АБМЯЖОЎВАЦЬ?

— Салёную, вострую, вэнджаную і смажаную. Усё гэта стымулюе выпрацоўку гастрыну ў надта вялікай колькасці. Здаецца, ну і няхай, аднак гэты гармон адказвае за выпрацоўку салянай кіслаты. Больш гастрыну — больш кіслаты. Наогул яна пастаянна прысутнічае ў невялікай колькасці ў страўніку, яе колькасць павялічваецца падчас пераптраўлівання, аднак лішак салянай кіслаты траўмуе слізістую, а гэта можа спрыяць гастрыту з эрозіямі і язве.

### ЦІ ШКОДЗІЦЬ КУРЭННЕ?

— Нікацін і іншыя прадукты тытунёвага дыму парушаюць ахоўны састаў слізі, якая пакрывае ўнутры страўнік. У залежных ад тытуню, як і ў тых, хто злоўжывае алкаголем, пастаянна выпрацоўваецца большая колькасць салянай кіслаты, узровень pH у страўніку паніжаецца, асяроддзе становіцца вельмі кіслым, а гэта, як было сказана вышэй, павышае рызыку развіцця эрозій і язвы.

### НАВОШТА РЭЖЫМ ХАРЧАВАННЯ?

— Таму што гэта адпавядае фізіялогіі. Арганізму патрэбна рытмічнае паступленне ежы — 4-5 разавае харчаванне. І справа не толькі ў калорыях і карысных рэчывах, але і ў неабходнасці рэгулярна нейтралізаваць саляную кіслату. Калі вы будзеце харчавацца раз на суткі, то «не пагашаная» ежай кіслата зробіць сваю шкодную справу — справакуе кіслотазалежныя эрозіі і язвы... Сучасная дыеталогія не падтрымлівае ні галадання, ні працяглых разгрузачных дзён. Прычым важна гэта не толькі для страўніка, але і для іншых органаў стрававання, напрыклад, для падстраўнікавай залозы і жоўцевага пузыра, якія выпрацоўваюць свае ферменты, і ім таксама трэба расходавацца. Калі мы не расходуем на пераптраўліванне ежы жоўць, яна пераворыцца ў камяні — вось і жоўцекамянёвая хвароба.

### НІЯКІХ РАЗГРУЗАЧНЫХ ДЗЁН?

— Разгрузачныя дні трэба выкарыстоўваць правільна. Напрыклад, адмаўляцца ад тлустых, смажаных, мясных прадуктаў і рабіць акцэнт на рыбе, садавіне, агародніне. Цалкам адмаўляцца ад мяса не варта. Натуральнае мяса — гэта нармальнае развіццё і здароўе арганізма дзяцей і дарослых. Проста не трэба захапляцца мяснымі прадуктамі штодня. Наогул доўга сядзець на разгрузках, дыетах нельга. Заўважце, што менавіта поўныя людзі часта сядзяць на дыетах, штосьці абмяжоўваюць, а хударлявыя ядуць часта і захоўваюць нармальную вагу. Важна не пераядаць, каб страўнік не запаўняўся надта шчыльна.

### ЗАПІВАЦЬ ЦІ НЕ?

— Перад ежай рэкамендуецца піць звычайную, не газіраваную і не мінеральную ваду. Наогул жа ніхто не адмяняў меню з трох страў — першай, другой і трэцяй. А трэцяя — гэта кісель, сок, кампот і г.д. Што да чаю, то пажадана яго выпіць асобна, без булачкі або піражнага. Каву ў гарачы час года трэба абмяжоўваць — яна абязводжвае арганізм. А вось звычайнай вады нам патрэбна каля 1,5-2 л у суткі. Нават хворым людзям, тым, хто баіцца ацёкаў, неабходна абмяжоўваць соль, але не ваду.

### ЯК УЗНІКАЕ ЯЗВА?

— Фактычна ў ста працэнтах выпадкаў язва дванаццаціперснай кішкі абумоўлена дзейнасцю мікроба хелікабактар пілары. Язву страўніка гэты мікраарганізм выклікае крыху радзей — прыкладна ў палове выпадкаў. Хелікабактар перадаецца праз посуд, пацалункі і г.д. Таму інфіцыравацца можна як у хатніх умовах, так і ў месцах грамадскага харчавання — там, дзе не карыстаюцца машынамі для мыцця посуду з неабходным тэмпературным рэжымам вады. Усё ж такі мікроб даволі ўстойлівы і гіне пры тэмпературы ў 90 градусаў! Мікробу падабаецца як кіслае, так і шчолачнае асяроддзе, а таму ён няблага сябе адчувае і ў страўніку, і ў дванаццаціперснай кішцы. Як толькі хелікабактар пілары трапляе ў клетку эпітэлію слізістай абалонкі, то пачынае выпрацоўваць урэазу — фермент, шкодны для эпітэлію. Праз нейкі час гэтае шкоднае ўздзеянне выклікае запаленне, эрозію, гемарагічны (кроватачывы) гастрыт, язву і нават рак. Адкрылі мікраарганізм у 1930-я, але думалі, што ён бяспечны, і толькі ў 1980-я аўстралійскія даследчыкі даказалі сувязь хелікабактарнай інфекцыі з развіццём язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Аднак далёка не ўсе носьбіты гэтага мікроба, а гэта каля 70 працэнтаў дарослага насельніцтва, пачынаюць хварэць. Прычыны яшчэ вывучаюцца, аднак ужо вядома, што існуюць розныя штамы мікроба — больш ці менш небяспечныя.



### І ЛЕКІ ВІНАВАТЫЯ?

— І эрозіі (павярхоўныя пашкоджанні слізістай), і язвы (пашкоджанні, якія дасягнулі мышачнай сценкі страўніка) могуць выклікаць некаторыя лекі, у першую чаргу нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты (аспірын, бруфен, ібупрафен, дыклафенак і г.д.) і кортыкастэроіды (прэднізалон, гідракарцізон і г.д). Яны шкодзяць некаторым пацыентам нават у мікрадозах і нават у выглядзе рэктальных свечак, паколькі з токам крыві лекі ўсё роўна дасягаюць усіх органаў, у тым ліку слізістай страўніка.

### ЯКІМ БЫВАЕ ЛЯЧЭННЕ?

— Дзякуючы такім магутным супрацькіслотным прэпаратам, як інгібітары пратоннай помпы, можна на працяглы час блакіраваць паталагічна высокі ўзровень салянай кіслаты. Гэта спрыяе загойванню язвы і поўнаму выздараўленню. Так лечацца язвы, звязаныя з дзеяннем лекавых прэпаратаў і абумоўленыя наяўнасцю цяжкіх захворванняў унутраных органаў (цыроз, ныркавая, сардэчная, дыхальная недастатковасць). Тут важна ведаць, што ў такіх выпадках язвавае захворванне развіваецца без усякіх асаблівых сімптомаў, а гэта вельмі небяспечна, паколькі аднойчы сценка страўніка разрываецца, змесціва трапляе ў брушную поласць, і хворы можа загінуць ад перытаніту. Калі язва абумоўлена наяўнасцю хелікабактарнай інфекцыі, пацыенту прызначаецца амбулаторнае лячэнне з выкарыстаннем адразу двух антыбіётыкаў. Толькі пэўныя прэпараты ў пэўных дозах і з пэўнымі тэрмінамі ўжывання дазваляюць вынішчыць мікраарганізм. Гэта можа быць такая схема: кларытрамецын (0,5 г 2 разы ў дзень), амоксіцылін (1 г 2 разы ў дзень) плюс прэпарат з ліку інгібітараў пратоннай помпы, напрыклад, амепразол. Прэпараты можна замяніць, калі ў пацыента ўзнікае лекавая непераноснасць. Антыбіётыкі прызначаюцца на 10 дзён, антыкіслотны прэпарат — да 2-4 месяцаў у залежнасці ад паталогіі.

■ Здаровае харчаванне

## ТОЛЬКІ НЕ ДЫЕТА!

**Дыет для пахудзення безліч, і кожная абяцае выдатны вынік — проста імгненнае пазбаўленне лішняй вагі. Але якой цаной? Пра гэта звычайна — ні слова. Як і пра тое, што рабіць далей, калі ўжо трэба «злазіць»... Наступны раз, калі вам зноў «засвярбіць» выпрабаваць на сабе штосьці «кефірнае», «толькі яблыкі» і г.д., вазьміце на ўзбраенне інфармацыю, якой кіруюцца звычайна спецыялісты ў галіне здаровага харчавання і ладу жыцця. Паспрабуйце ацаніць выбраную вамі дыету па наступных пазіцыях.**

• Ці можна на гэтай дыеце жыць працяглы час так, каб не страціць фізічнае і псіхічнае здароўе? Усё, чым можна карыстацца толькі кароткі час, забяспечвае такі ж самы кароткі вынік.

• Ці не прапануе дыета рацыён з каларыйнасцю, ніжэйшай за 1200 ккал (павінна быць не менш за 20 ккал на 1 кг вагі)? Пры такім раскладзе немагчыма атрымаць неабходныя рэчывы.

• Дыета не можа цалкам выключаць з рацыёну бялкі або тлушчы, або вугляводы. Нам неабходна і першае, і другое, і трэцяе. Здаровае харчаванне — разнастайнае.

• Калі дыета змяшчае нейкія цяжкія для выканання моманты — піць штосьці цягам дня або гатаваць па некалькі гадзін, то гэта пройгрышны варыянт. Усё гэта хутка абрыдне.

• Цягам тыдня можна страціць толькі 1 кг тлушчу. Усё астатняе — мышцы і вада. Ваду можна папоўніць, хоць яе дэфіцыт абяцае больш хуткае старэнне арганізма, а вось мышцы аднаўляюцца даўжэй і цяжэй.

• Адмятайце ўсё, што суправаджаецца словамі «магічная», «тлушч растварaецца на вачах», «без усякай фізічнай нагрузкі» і г.д.

• Заглушайце жаданне набыць якія-небудзь пілюлі, якія «ўзмацняюць эфект» пахудзення.

### Што трэба зрабіць?

1. Арганізуйце сябе. Трэба прызвычаіцца есці прыкладна ў адзін і той жа час (умоўна кажучы, у 10.00, 14.00 і 18.00). Цягам 16 гадзін у суткі есці не трэба.

2. Калараж прадуктаў трэба адсочваць і ўлічваць.

### Што такое «разнастайнае меню»?

Эксперты па харчаванні Гарвардскай школы грамадскай аховы здароўя ні ад кога не хаваюць «Талерку здаровага харчавання». Яна заснавана на апошніх навуковых доказах, якія сведчаць, што дыета, багатая на гародніну, цэльнае зерне, здаровыя тлушчы і здаровыя бялкі зніжае рызыку росту вагі і развіцця хранічных захворванняў.

**Вось што павінна быць у гарвардскай талерцы:**

**1. Гародніна.** Самая розная, абмяжоўваць толькі бульбу, багатую на крухмал, які хутка пераптраўліваецца і выклікае кароткатэрміновыя ўсплёскі ўзроўню цукру ў крыві, як і прадукты з ачышчанага зерня і прысмакі.

**2. Садавіна.** Розная, штодня.

**3. Цэльнае зерне.** Аўсянка, цэльназерневы хлеб, карычневы рыс.

**4. Бялкі.** Рыба, птушка, бабовыя, арэхі. Абмяжуйце чырвонае і перапрацаванае мяса.

**5. Алей.** Для гатавання страў, у салатах. Абмяжуйце масла і транстлушчы, маргарын.

**6. Вада.** Піце ваду, чай або каву (з невялікай колькасцю цукру ці без яго). Абмяжуйце малако і малочныя прадукты да адной-дзвюх порцый на дзень і соку да адной невялічкай шклянкі на дзень, пазбягайце напояў з цукрам.



**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

**в изменение к ранее опубликованным в газете «Звязда» декларациям.**

**Застройщик** – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 256-64-18.

**Режим работы** – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство 10-этажного жилого дома № 22 по генплану, расположенного во Фрунзенском административном районе г. Минска, на территории бывшей деревни Сухарево.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 8 квартир: 1 трёхкомнатная квартира № 56 площадью 85,41 кв.м; 7 трёхкомнатных квартир (№№ 43, 47, 55, 63, 67, 71, 79) площадью 85,61 кв.м.

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет при строительстве трёхкомнатной квартиры – 14 700 000 белорусских рублей.

Начало строительства – 25.11.2014 года, окончание – сентябрь 2015 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 102, тел. 256-64-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) лица, с кем заключается договор;
- оплата 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 (трёх) банковских дней с даты получения договора.

Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв.м общей площади квартир и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.

# ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Наличие инженерных сетей (водоснабжение, электроснабжение), наличие ограничений | Начальная цена, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Расходы по изготовлению документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Веснино, ул. Солнечная, 25А, кадастровый номер 623286301101000085 | 0,1114 | Электроснабжение. Водоснабжение. Ограничения: водоохранная зона реки Веснянка — 0,1114; зона санитарной охраны водных объектов, используемых для питьевого водоснабжения — 0,0985; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения — 0,0119 | 22 907 450 | 2 290 700 | 13 797 850 |
| 2 | д. Веснино, ул. Солнечная, 28А, кадастровый номер 623286301101000086 | 0,1270 | Электроснабжение. Водоснабжение. Ограничения: водоохранная зона реки Веснянка — 0,1270; зона санитарной охраны водных объектов, используемых для питьевого водоснабжения — 0,0082 | 26 115 300 | 2 611 500 | 13 797 850 |
| 3 | д. Веснино, ул. Солнечная, 28Б, кадастровый номер 623286301101000087 | 0,1200 | Электроснабжение. Водоснабжение. Ограничения: водоохранная зона реки Веснянка — 0,1200 | 24 675 850 | 2 467 600 | 13 269 350 |
| 4 | д. Бояры, ул. Солнечная, 10А, кадастровый номер 623286301101000065 | 0,1051 | Электроснабжение. Водоснабжение. Ограничения: водоохранная зона реки Веснянка — 0,1051; охранная зона ЛЭП до 1000 Вольт — 0,0027; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения — 0,0006 | 22 212 300 | 2 221 200 | 14 056 550 |

Аукцион проводится **6 июля 2015 года в 10.00** в здании Совета, документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, **по 29 июня 2015 года включительно.** Ксерокопия паспорта и квитанция об оплате задатка обязательны.

*Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 ф-ла № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» код 153001601. УНН 600537220. Код платежа 04901. Получатель – Острошицкий сельисполком. Победитель обязан в течение 10 дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.*

**Телефоны для справок: 8 01774 57621, 8 01774 57635.**

**Управляющий научно-производственного общества с ограниченной ответственностью «Продукты питания» (УНП 101222586) – частное предприятие «Гетман и Партнеры» – организатор торгов извещает о проведении 03.07.2015 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Славинского, 1, каб. 204, – открытых торгов в форме аукциона (на повыш. нач. цены) по продаже следующего имущества единым лотом:**

**1. Здание цеха по производству майонеза и маргарина, инв. №620/С-32799 – одноэтажное капитальное строение с пристройками, стены кирпичные и блочные, общая площадь объекта оценки 766,8 кв.м, объем 3067 куб.м, год постройки здания цеха 1959, год постройки пристроек 2002–2009. Состояние объекта: нормальное. Назначение: Здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака. Дополнение: покрытие асфальтовое, площадь 1186 кв.м.**

**Канализационные сети, инв. №620/С-32492 – протяженность 715,1, трубопровод чугунный, ПЭ, керамический, год постройки н/у. Состояние: удовлетворительное. Назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства.**

**Начальная стоим. 1 372 800 000 руб. (без учета НДС), шаг торгов – 10% от начальной стоимости.**

Место нахождения предмета торгов: г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1.

**Задаток для участия в торгах по данному лоту составляет 137 280 000 рублей.**

*Задаток для участия в торгах вносится на счет частного предприятия «Продукты питания» (р/с 3012100200017 в ОАО «Технобанк», код 182, УНП 101222586, назначение платежа: задаток для участия в торгах 03.07.2015 г. Оплата производится с даты настоящей публ. по 02.07.2015 г. вкл.*

Прием заявок по адр. проведения торгов с даты наст. публикации до 02.07.2015 г. с 9.00 до 18.00 (кроме вых. и празд.); ознакомление с состоянием имущества по месту нахождения имущества, предварительно согласовав время по тел. +375 29-6745810. Победителем торгов является участник, предложивший наибольшую цену за предлагаемый к продаже лот. Победитель торгов в теч. 15 календ. дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3-х дн. с м-та утв. протокола об итогах торгов.

Лица, подавшие заявки на участие в торгах, имеют право отказаться от участия в торгах в срок до 18.00 02.07.2015 г. В случае признания торгов несостоявшимися в виду подачи заявления на участие только одним участником, возможна продажа данного объекта заявившемуся участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5%.

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Независимая строительная экспертиза

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «Алеся», 8(0232) 36 37 65

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (магазин) с инв. №350/С-159397, площадью 152,0 кв.м (составные части и принадлежности: четыре кирпичные пристройки), капитальное строение (сарай) с инв. № 350/С-73398, площадью 28,6 кв.м.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000008000398 площадью 0,0462 га.<br>Капитальное строение (приемный пункт) с инв. №350/С-65575, площадью 67 кв.м.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000008004355 площадью 0,0463 га.<br>- Световая реклама с инв. №23070, сигнализация с инв. №22567, видеонаблюдение с инв. №22875.<br>Цель использования объекта: торговля продовольственными товарами. | 1 600 490 000 | 160 049 000 |

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта продажи** | г. Гомель, ул. Магистральная, 14 |
| **Срок подачи заявления** | **По 22 июня 2015 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 17⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **24 июня 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи. Победителю предоставляется рассрочка платежа на 6 (шесть) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс), сайт www.bti.by**

# ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5 | 237 525 | 313 784 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6 | 2 779 223 | 2 320 378 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 7 | 362 123 | 503 553 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 8 | 51 045 | 8 648 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 9 | 6 474 299 | 5 069 670 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 10 | 638 760 | 445 279 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 11 | 22 | 22 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 12 | 489 815 | 425 892 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 13 | 28 353 | 5 417 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 14 | 3 357 | - |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | 15 | 142 645 | 87 660 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | 11 207 167 | 9 180 303 |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | 504 882 | 499 130 |
| 20 | Средства банков | 1202 | 16 | 4 289 265 | 3 118 043 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | 17 | 4 589 141 | 4 629 911 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 18 | 75 860 | 14 105 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 3 018 | - |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | 19 | 263 120 | 207 259 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 9 725 286 | 8 468 448 |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 779 620 | 84 370 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | 34 320 | 34 320 |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 76 721 | 58 384 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 235 717 | 198 833 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 355 503 | 335 948 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку | | | 1 481 881 | 711 855 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 481 881 | 711 855 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 11 207 167 | 9 180 303 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 113 093 | 786 612 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 661 712 | 509 251 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 21 | 451 381 | 277 361 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 492 800 | 338 892 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 83 534 | 50 635 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 22 | 409 266 | 288 257 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 23 | 162 | 7 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 24 | (132 691) | (40 553) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 25 | 239 630 | 50 541 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 26 | 381 439 | 85 813 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 27 | 80 057 | 59 271 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 28 | 498 782 | 372 138 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 29 | 18 467 | 12 760 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 149 117 | 164 173 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 15 061 | 15 702 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 134 056 | 148 471 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | | 30 | 92 734 | 527 929 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |
| | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | | 134 056 | 148 471 |
| | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 134 056 | 148 471 |
| | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал, принадлежащий головной организации-банку | доля неконтролирующих акционеров | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3011 | 84 370 | 34 320 | 22 938 | 222 362 | 158 857 | 522 847 | - | 522 847 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 35 446 | 113 585 | 39 977 | 189 008 | - | 189 008 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 148 471 | 40 107 | 188 578 | - | 188 578 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 35 446 | (35 446) | x | - | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | - | x | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 130 | (130) | - | x | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 430 | - | 430 | - | 430 |
| | Приобретение дочернего юридического лица | | x | x | x | x | x | x | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3013 | 84 370 | 34 320 | 58 384 | 335 947 | 198 834 | 711 855 | - | 711 855 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3011 | 84 370 | 34 320 | 58 384 | 335 947 | 198 834 | 711 855 | - | 711 855 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 695 250 | - | 18 337 | 19 556 | 36 883 | 770 026 | - | 770 026 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 134 056 | 41 579 | 175 635 | - | 175 635 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 18 337 | (18 337) | x | - | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 695 250 | - | x | (100 601) | x | 594 649 | x | 594 649 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 695 250 | - | x | x | x | 695 250 | x | 695 250 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (100 601) | x | (100 601) | x | (100 601) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 4 696 | (4 696) | - | x | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (258) | - | (258) | - | (258) |
| | Приобретение дочернего юридического лица | | x | x | x | x | x | x | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3013 | 779 620 | 34 320 | 76 721 | 355 503 | 235 717 | 1 481 881 | - | 1 481 881 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЕ СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) за отчетный период | 301211 | 31 | 134 056 | 148 471 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период | 301212 | 31 | 41 579 | 40 107 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | 31 | 41 579 | 40 107 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | 31 | 175 635 | 188 578 |
| 4 | Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации-банку | | | 175 635 | 188 578 |
| 5 | Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе | | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 1 077 136 | 757 484 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (638 144) | (490 345) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 469 168 | 332 862 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (86 963) | (50 132) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 162 | 7 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 136 441 | 24 572 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 63 309 | 33 241 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (497 003) | (344 376) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (18 418) | (15 702) |
| 13 | Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах | 701 | | 505 688 | 247 611 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (695) | (7 140) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (9 265) | (143 704) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (42 222) | 29 198 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (1 393 578) | (886 746) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 118 853 | 24 002 |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | 24 447 | 108 313 |
| 20 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов | 702 | | (1 302 460) | (876 077) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 4 | 6 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 598 987 | 824 612 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | (481 200) | 529 007 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 50 330 | (8 613) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (69 686) | (37 043) |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (60 272) | 69 393 |
| 27 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств | 703 | | 38 163 | 1 377 362 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | 32 | (758 609) | 748 896 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 71100 | | (58 016) | (101 390) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 3 575 | 13 009 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | 32 | (54 441) | (88 381) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 695 250 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (100 602) | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 594 648 | - |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | 32 | 50 767 | 43 151 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | 32 | (167 635) | 703 666 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 1 334 878 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 32 | 1 167 243 | x |

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**

**Главный бухгалтер** **М.В. Дудко**

**Дата подписания «05» мая 2015 г.**

Годовая консолидированная финансовая отчетность банка в соответствии с НСФО за 2014 год в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: **www.vtb-bank.by.** УНП 101165625.

EY
Совершенствуя бизнес, улучшаем мир

**Ernst & Young LLC**
Klary Tsetkin st, 51A, 15th floor
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 240 4242
Fax: +375 (17) 240 4241
www.ey.com/by

**ООО «Эрнст энд Янг»**
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Клары Цеткин, 51А, 15 этаж
Тел.: +375 (17) 240 4242
Факс: +375 (17) 240 4241

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

**независимой Аудиторской организации ООО «Эрнст энд Янг» по годовой консолидированной финансовой отчетности ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) и его дочерней организации как банковского холдинга, подготовленной по итогам деятельности за 2014 год**

Г-ну Иванову Владимиру Владимировичу
Председателю Правления ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Акционерам, Совету директоров и Правлению ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Национальному банку Республики Беларусь

Мы провели аудит прилагаемой годовой консолидированной финансовой отчетности Закрытого Акционерного Общества Банк ВТБ (Беларусь) и его дочерней организации как банковского холдинга (далее «Банк»).

В соответствии с Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 511 «Об утверждении Инструкции по составлению консолидированной финансовой отчетности банковских групп, банковских холдингов», годовая консолидированная финансовая отчетность ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) состоит из:
- Консолидированного бухгалтерского баланса на 1 января 2015 года (Форма 1);
- Консолидированного отчета о прибылях и убытках за 2014 год (Форма 2);
- Консолидированного отчета об изменении собственного капитала за 2014 год (Форма 3);
- Консолидированного отчета о движении денежных средств за 2014 год (Форма 4);
- Примечаний к годовой консолидированной финансовой отчетности.

Указанная годовая консолидированная финансовая отчетность была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года № 728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 511 «Об утверждении инструкции по составлению консолидированной финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года № 15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе», с изменениями и дополнениями и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).

Согласно критериям, определенным Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 511 «Об утверждении инструкции по составлению годовой консолидированной финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», годовая консолидированная финансовая отчетность Банка как банковского холдинга на 1 января 2015 года включает финансовую информацию ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) и его дочерней организации ООО «СНБ-Агро».

*Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке годовой консолидированной финансовой отчетности*

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и представление годовой консолидированной финансовой отчетности, прилагаемой на пятидесяти семи листах, в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности за систему внутреннего контроля, необходимую для составления годовой консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

*Обязанности Аудиторской организации*

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности годовой консолидированной финансовой отчетности во всех существенных аспектах в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 12 июля 2013 года № 56-З и национальными правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в годовой консолидированной финансовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в годовой консолидированной финансовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления годовой консолидированной финансовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение* По нашему мнению, годовая консолидированная финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка и его дочерней организации как банковского холдинга по состоянию на 1 января 2015 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 57-З «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 12 декабря 2013 года № 728 «Об утверждении Инструкции об организации ведения бухгалтерского учета и составления отчетности в Национальном банке Республики Беларусь, банках и небанковских кредитно-финансовых организациях Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 511 «Об утверждении инструкции по составлению консолидированной финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 января 2007 года № 15 «Об установлении форм отчетности для головных организаций банковских групп, банковских холдингов и утверждении Инструкции о порядке осуществления надзора за банковской деятельностью на консолидированной основе», с изменениями и дополнениями и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

*Прочие вопросы*

Годовая консолидированная финансовая отчетность не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах, помимо Республики Беларусь. Соответственно, годовая консолидированная финансовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия годовой консолидированной финансовой отчетности Банка требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в годовой консолидированной финансовой отчетности.

Дата аудиторского заключения: 13 мая 2015 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 13 мая 2015 года.

Лащенко Павел Анатольевич
Директор ООО «Эрнст энд Янг»

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 21 октября 2014 года).

Станкевич Иван Вячеславович
Заместитель директора по аудиту, аудитор ООО «Эрнст энд Янг»

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0002137 от 2 октября 2013 года, без ограничения срока действия.

Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 74 от 15 января 2014 года, без ограничения срока действия.

Председатель Правления ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) В.В. Иванов

Директор ООО «Эрнст энд Янг» П.А. Лащенко

■ Навука для жыцця

# Растлумачыць лёс па пальцах

## Ці можна па адбітках вызначыць здольнасці чалавека?

**«Куды пайсці вучыцца? Якая прафесія вам падыходзіць? Генетычны тэст раскрые ваш патэнцыял па адбітках пальцаў за 10 хвілін!» — на такую аб'яву мы наткнуліся ў сеціве. І, вядома, зацікавіліся: каму ж не хочацца даведацца пра свае схільнасці? Тым больш праект, паводле апісання на сайце, — навуковы: праграма распрацавана Новасібірскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам, прайшла лабараторныя выпрабаванні і запатэнтавана. Тэсціруюць, зразумела, не бясплатна. Цана пытання — 350 тысяч рублёў (калі прыйдзеце ўтрох, можна сэканоміць: заплаціце 700 тысяч за ўсіх). Але хто яго ведае: мо сапраўды сучасным тэхналогіям дастаткова прааналізаваць узоры на пальцах, каб вызначыць здольнасці чалавека? Мы вырашылі не губляцца ў здагадках, а пайшлі і праверылі на сабе, як працуе тая праграма.**

### ГЕНІЯЛЬНЫЯ ЗАВІТКІ

Запісацца на генетычны тэст атрымалася хутка. Сярод беларусаў падобныя паслугі пакуль не папулярныя (за тыдзень чалавекі два згаджаюцца прайсці экспертызу), таму чакаць сваёй чаргі не прыйшлося. І ўжо на наступны дзень я ехала ў другі канец горада, каб пачуць пра свой патэнцыял.

Працэдура вельмі простая. Скануюцца ўсе пальцы на левай і правай руках (кладзеш іх на спецыяльны прыбор, чымсьці падобны да камп'ютарнай мышкі), на манітор выводзяцца павялічаныя выявы адбіткаў, і кансультант суадносіць іх з тыпамі ўзораў, што ёсць у базе (дугі, петлі і завіткі). Адзінае, пра што пытаюць, — імя і ўзрост. Потым гэтая інфармацыя дасылаецца на сервер кампаніі, аўтаматычна апрацоўваецца і ўжо праз пару хвілін прыходзіць 15-старонкавая справаздача пра закладзеныя ў табе магчымасці. З хірамантыяй і цыганскай варажбой тэхналогія, як мне патлумачыў **прадстаўнік «Генетык-тэст» у Мінску Юрый ПАНЕЎЧЫК**, не мае нічога агульнага. Гэта навуковае даследаванне, а не прадказанне, атрыманае праз інтуіцыю ці «сувязь з космасам».

Пытаюся: а калі самому ўважліва разглядзець пальцы і вызначыць, петлі там ці завіткі, можа, і без дадатковых прылад атрымаецца зрабіць высновы пра свае здольнасці?

— Наўрад ці. Важныя не толькі ўзоры, але і іх камбінацыі, — тлумачыць Юрый.

Пэўную залежнасць прасачыць усё ж такі можна. Чым больш мудрагелісты малюнак (найвышэйшая ступень складанасці прыпісваецца завіткам), тым большая верагоднасць, што ты звышталенавіты. Мой суразмоўца ўзгадвае, як аднойчы на тэсціраванне бацькі прывялі вундэркінда. Адзінаццацігадовы хлопчык, пакуль яго равеснікі вучыліся ў 4 класе, паспяхова засвойваў праграму для дзевяцікласнікаў. Пра талент дзіцяці бацькі адразу не прызналіся (раптам, пачуўшы гэта, кансультант падробіць вынікі?), але ўжо на сканаванні адбіткаў усё стала зразумела: у малога адны завіткі! Цікава, што ў хлопца аказаліся неверагодныя здольнасці не толькі да навукі (у вундэркіндаў звычайна ж так бывае), але і да спорту. Потым выявілася, што школьнік насамрэч займаецца плаваннем і на спаборніцтвах заўсёды сярод першых.

На тэст звычайна прыводзяць дзяцей: бацькі хочуць даведацца, у якія секцыя — спартыўныя, творчыя — лепш аддаць сыноў і дачок. Бывае, завітваюць і 40-гадовыя асобы, незадаволеныя сваім цяперашнім месцам працы. Апошнім часам экспертызай сталі цікавіцца абітурыенты і выпускнікі ВНУ.

— Нядаўна дзяўчына прыходзіла, улетку заканчвае эканамічны факультэт, — распавядае Юрый. — Бацька кліча працаваць на сваю фірму (спецыяльнасць «эканоміка», дарэчы, таксама хутчэй яго выбар, чым дачкі), а ў яе душа да гэтага не ляжыць. Хоча быць цырульніцай. Вось і вырашыла праверыць, да чаго ад прыроды ў яе схільнасцяў больш...



### ТЛУСТАЕ І АЛКАГОЛЬ ГЕНЕТЫКА ЗАБАРАНЯЕ

Пра што ж нарэшце могуць расказаць адбіткі пальцаў? Гартаю справаздачу. Распрацоўка новасібірскіх навукоўцаў паказвае, які тып адукацыі (гуманітарны, прыродазнаўчы, тэхнічны, матэматычны, лінгвістычны ці сацыяльна-эканамічны) і напрамак прафесійнай дзейнасці (камунікацыі, аналітыка і практыка) вам больш падыходзяць, ці ёсць здольнасці да спорту і творчасці. А вось цікавы пункт — мадэль самарэалізацыі. Мяркуючы па маіх пальцах, начальнікам мне не быць: кіраўнічы тып паводзін уласцівы толькі на 10 працэнтаў.

— Навошта так катэгарычна? Калі захочаце, будзеце начальнікам. Толькі для гэта прыйдзецца прыкласці больш намаганняў, — запэўніваюць мяне. Ну, гэта і без тэста зразумела.

Чытаю далей. Наступны блок інфармацыі тычыцца здароўя. Тут прапісаны фактары рызыкі. Праграма рэкамендуе мне больш уважліва сачыць за органамі стрававання (бывайце, блінцы з 25-працэнтнай смятанкай!) і печанню з ныркамі (белае паўсалодкае, прабач, генетыка супраць нашага сяброўства). Тым больш прырода, згодна з вынікамі тэста, яшчэ і схільнасцю да паўнаты мяне ўзнагародзіла (трэба гэта бабулі расказаць — от радасці будзе!). Наколькі звесткі адпавядаюць рэальнасці, сказаць складана: па ўрачах, тым больш вузкіх спецыялістах, хаджу рэдка.

Што там яшчэ засталося? Ага, фізічныя магчымасці арганізма. Праграма вызначае, наколькі ў вас развіта хуткасць, вынослівасць і каардынацыя, да якіх відаў спорту ёсць схільнасць. Спартыўныя здольнасці, дарэчы, сапраўды значна залежаць ад генетычнага кода. Ёсць нават аналіз (у Беларусі таксама праводзіцца), што распазнае ў чалавеку спрынтара ці стаера. Не па адбітках, праўда.

Па водгуках, вынікі тэста па ўзоры на пальцах маюць рацыю ў 90 працэнтах выпадкаў. У мяне, калі шчыра, таксама аказалася шмат супадзенняў. Навука? Ці проста звычайная здольнасць розуму шукаць прычынна-выніковыя сувязі нават там, дзе іх няма? У любым выпадку (гэта адзначаюць і стваральнікі праграмы) генетыка не адзінае, што вызначае натуру чалавека. Нельга недаацэньваць ролю асяроддзя, выхавання і сілы волі. Калі не працаваць над сабой, любыя здольнасці так і застануцца патэнцыяльнымі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

#### УЗОРЫ ДНК

Як тлумачаць навукоўцы, адбіткі пальцаў фарміруюцца на 13-м тыдні адначасова з нервовай сістэмай з адных і тых жа зародкавых лісткоў. Таму ўзоры генетычныя маркеры і звязаны з фізічнымі і псіхалагічнымі прыкметамі. **Намеснік дырэктара па навукова-інавацыйнай працы Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Алена ГУЗЕНКА** пацвердзіла, што падобныя тэсты цалкам навуковыя:

— Існуе асобная навука — дэрматагліфіка, якая аналізуе папілярныя лініі далоні. У Беларусі гэтымі даследаваннямі таксама займаюцца. Як генетыка праяўляецца ў адбітках? Узоры на пальцах з'яўляюцца ў выніку біяхімічных працэсаў у арганізме, а ўся біяхімія завязана на ДНК. Увогуле, цяпер распаўсюджана праводзіць ДНК-тэст, каб вызначыць схільнасці чалавека. Напрыклад, аналіз сліны паказвае здольнасць асобы да спорту, верагоднасць сардэчна-сасудзістых захворванняў. Аднак гэта толькі магчымыя характарыстыкі, якія не абавязкова праявяцца.

---

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## ЯК ПАСЫНКАВАЦЬ ПАМІДОРЫ?

**Усе ведаюць, што многія таматы валодаюць асаблівасцю даволі моцна галінавацца. Практычна з кожнай пупышкі, якая знаходзіцца ў пазусе ліста на галоўным сцябле расліны, затым вырастае бакавы парастак-пасынак. Выдаленне менавіта такіх парасткаў і называюць пасынкаваннем.**



### ДЛЯ ЧАГО ГЭТА ТРЭБА?

Калі вы не будзеце пасынкаваць свае памідоры, то на іх будзе вельмі шмат парасткаў са мноствам кветкавых гронак. Вядома, пры гэтым і пладоў завязваецца досыць шмат, але вось выспяваюць яны далёка не ўсе — з-за кароткага перыяду вегетацыі. Так што ў гэтым выпадку ўраджай большым не будзе. Сам працэс пасынкавання робіць значна лепшым прыток шматлікіх пажыўных рэчываў да пладоў і да лісця, значна паскарае паспяванне пладоў і павялічвае іх памер.

### ФАРМІРОЎКА

На вуліцы звычайна высаджваюць таматы нізкарослых сартоў, якія фарміруюцца толькі ў адзін ствол. Пасынкі варта выдаляць кожны тыдзень (пакуль па даўжыні яны яшчэ не сталі больш за 3-4 сантыметры), але пры гэтым варта пакідаць 4-5 гронак. На нармальна развітай расліне, якая расце ў адкрытым грунце, менавіта такой колькасці будзе цалкам дастаткова. Калі мы праводзім фарміроўку ў адно сцябло, даглядаць расліну нашмат лягчэй і не прыйдзецца думаць, што зламаць, а што варта абавязкова пакінуць.

### ПРЫШЧЫПКА

Калі гатунак у вас высакарослы, то тут адным пасынкаваннем не абысціся, трэба таксама правесці і прышчыпванне. Гэта значыць выдаліць у такіх сартоў пункт росту, які знаходзіцца на пакінутых парастках. Такую прышчыпку трэба праводзіць тыдні за 2 ці 3 да заканчэння вырошчвання культуры. У адзін час з правядзеннем прышчыпвання таксама трэба выдаліць яшчэ і суквецці, якія знаходзяцца ў працэсе бутанізацыі ці толькі пасля цвіцення, бо з такіх бутонаў, мноства кветак і нават з дробненькіх завязяў плады ўжо не паспеюць вырасці.

### ДАЛОЎ ЛІШНЯЕ ЛІСЦЕ!

Не трэба забывацца выдаляць у расліны і ўсе старыя лісточкі, якія ўжо пажоўклі або пачынаюць жоўкнуць знізу. Такія «галаногія» кусцікі таматаў будуць лепш «дыхаць паветрам» і менш хварэць, а галоўнае — ураджайнасць у такіх «галякоў» нашмат большая. Старыя лісты трэба пачаць выдаляць, калі на першай гронцы заружавее плод. Калі ж пачнуць спець плады ўжо на другой, усе лісточкі да першай гронкі ўжо павінны быць абарваны цалкам.

Дарэчы, адна з такіх асноўных прычын, якая прыводзіць да дрэннай завязі помідораў на першых гронках куста, нават пры добрым цвіценні і сілкаванні ўсёй расліны, гэта звычайна недахоп святла, які і выклікае з'яўленне вялікай колькасці непатрэбнага лісця на расліне.

### УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СОРТУ!

Зараз прадаюць сарты, якія не пасынкуюцца. Такія гатункі кусцяцца дрэнна і даюць зусім мала бакавых парасткаў. З імі і клопатаў нашмат менш. Але ж каб атрымаць ураджай крыху раней, усё лішняе ўсё ж варта выдаліць у канцы чэрвеня.

Часта ў літаратуры можна прачытаць, што пры пасынкаванні варта пакідаць невялікі пянёчак 0,5-1 см, каб новы пасынак на гэтым месцы адрасці ўжо не змог. Усё ж лепш гэтага не рабіць, па-першае, таму, што сам працэс пасынкавання моцна замарудзіцца, а па-другое — з'яўленне новых пасынкаў на гэтым жа месцы з'ява досыць рэдкая. Часцей пасынкі ўтвараюцца зусім у іншых месцах.

Пасынкаваць памідоры за сезон звычайна трэба разы два ці тры.

✓ Памятайце, што ў адкрытым грунце, калі прайшоў добры дождж або пасля багатага паліву, заўсёды трэба рыхліць міжраддзі і акучваць самі расліны. Пры гэтым тэмпература глебы вельмі сур'ёзна павышаецца, а гэта таксама паскарае паспяванне пладоў.

✓ Калі ж тэмпература ў пачатку жніўня на працягу 3-х сутак начамі паніжаецца, варта зняць (абавязкова!) усе зялёныя, бурыя і ружовыя плады і пакласці іх на даспяванне ў цёплае памяшканне.

## ДВУХГАДОВЫЯ КВЕТКІ

**Высадка двухгадовых квітнеючых раслін — выдатны спосаб узбагаціць і разнастаіць клумбу новымі фарбамі. Жыццёвы цыкл двухгодак дзеліцца на дзве вегетатыўныя стадыі: на працягу першага сезона расліна не цвіце, а толькі выпускае лісце, часта ўтвараецца небуйная разетка, а да зыходу наступнай вясны на ўчастку з'яўляюцца чаканыя кветкі.**



Цвіценне — самая маляўнічая фаза развіцця двухгадовых кветак, якая завяршаецца ўтварэннем насення і наступнай гібеллю расліны. Раннія прадстаўнікі кветкавай флоры пачынаюць выпускаць бутоны вясной. Да такой групы адносяцца незабудкі, віёлы, стакроткі, жаўтушнік і прымулы. Ружовая мальва, барадатыя гваздзікі або наперстаўка ўмоўна адносяцца да класа культур, якія цвітуць позна, паколькі расцвітаюць толькі з прыходам лета. Няхітрыя веды аб тэрмінах цвіцення дапамогуць стварыць кветнік, які радуе сакавітымі фарбамі аж да восені.

Часта двухгадовыя кветкі высаджваюць на пустыя ўчасткі паміж дрэвамі і кустамі, спалучаюць з насаджэннямі агародніны і травой. Дзякуючы прыгажосці, непераборлівасці і здольнасці да самасеву, двухгодкі карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Высаджваюць іх з мая па жнівень непасрэдна ў грунт або цяпліцу. Тыя віды, якія цвітуць рана, мэтазгодна перасаджваць у жніўні на новае пастаяннае месца. Двухгодкі, бутоны якіх распускаюцца летам, лепш размяшчаць на сталае месца ў клумбы толькі з надыходам вясны. Ва ўмовах суровага клімату на зіму ўчасткі з раслінамі варта замульчыраваць слоем саломы.

Для высадкі двухгадовых кветак неабходна ўзбагачаная ўгнаеннем глеба з добрай водапранікальнасцю, паколькі яны маюць патрэбу ў рэгулярным арашэнні і дастатковай асветленасці. Паліў і ўгнаенне якасным кампостам у сумесі з комплексным мінеральным саставам — немалаважныя складнікі правільнага догляду гэтых раслін. Пры існуючай верагоднасці запозненых маразоў насенне запланаваных да вырошчвання кветак варта высеяць у гаршкі і вырошчваць у цёплым памяшканні да наступлення тэрміну перасадкі. Так насенне прарасце хутчэй, а гатовая расада будзе мацнейшая.

У спецыяльных гадавальніках або садовай розніцы без цяжкасці можна знайсці ўжо прарошчаныя двухгадовыя кветкі і нават гатовую расаду ў кантэйнерах або вазонах. Праз нядоўгі час з моманту высадкі такія саджанцы пачнуць цвісці.

Для размнажэння двухгадовых кветак таксама можна выкарыстоўваць насенне, атрыманае з мінулых насаджэнняў. Большасць раслін могуць аднаўляцца самасевам, і для атрымання сеянцаў трэба толькі пакінуць частку суквеццяў на градцы і дачакацца поўнага паспявання насення.

### ПАМЯТКА САДАВОДА

## Маліна

• Не развязвайце маліну, пакуль не праведзяце апрацоўку.

• Начаранкуйце буйнаплодную і жоўтую. Змясціце ў вільготны мох на тыдзень у адрыну ці на 1–3 дні на веранду, потым пасадзіце ў парнічок пад плёнку.

• Першая апрацоўка — апырскванне бардоскай вадкасцю. Другая праз тыдзень — 3 жмені мачавіны на вядро вады з палівачкі.

• Ад малінавага жука і даўганосіка па бутонах — актэлік, фуфанон, карбафос. Памятайце: пры 13 градусах ён ужо выйшаў на паляванне. Паспрабуйце пару разоў апырскаць у канцы мая да бутонаў, каб парасткі не загіналіся.

• Народны сродак ад даўганосіка: 1 сталовая лыжка гарчыцы на 1 літр цёплай вады па бутонах, адвар палыну горкага. Раскладзіце палын пад малінай і па клубніцах.

• Паліваць, паліваць і яшчэ раз паліваць.

• Праполоць, абрэзаць, прыхіліць.



---

**Азбука народнай культуры** ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ВЯРОЎКА. Гэта звычайная ў паўсядзённым жыцці рэч у традыцыйнай культуры беларусаў набыла рытуальныя функцыі.

◈ Вяроўку ніколі не перадавалі з рук у рукі і не бралі «голымі» рукамі. Неабходна было сказаць, дзе ляжыць ці вісіць вяроўка або пакласці яе на зямлю, каб той, каму яна была патрэбна, узяў яе сам.

◈ Каб жывёла, якую куплялі, прыжылася ў гаспадарцы, а таксама каб «прывесці» ў сваю гаспадарку поспех і дабрабыт, пакупнік імкнуўся атрымаць тую вяроўку, на якой прывялі жывёлу на продаж.

◈ Калі гаспадар адмаўляўся прадаць, напрыклад, і карову, і вяроўку, тады рэзалі на дзве часткі: адну пакідалі сабе, другую аддавалі пакупніку.

◈ Каб у цяжарнай жанчыны не было выкідышу, ложак, на якім яна спала, абвязвалі вяроўкай.

◈ На Каляды вяроўкай звязвалі ножкі стала, каб летам скаціна вярталася дадому і не згубілася ў лесе, а ў коле, складзеным з вяроўкі, кармілі курэй, каб тыя не хадзілі па чужых падворках.

◈ На Масленіцу вяроўкамі перавязвалі пладовыя дрэвы, каб па восені сабраць добры ўраджай груш, сліў і яблыкаў.

◈ Вяроўку часта выкарыстоўвалі ў народнай магіі, часцей за ўсё на ёй завязвалі вузельчыкі і «адсылалі» на іх чужыя хваробы. «Замоўленую» вяроўку неслі ў лясны гушчар ці спальвалі на скрыжаванні дарог.

◈ Каб валасы ў дзяўчат лепей раслі, трэба было напярэдадні Раства пакласці вяроўку на падушку: «каб каса была даўжэйшай за вяроўку».

◈ Асаблівыя адносіны былі да вяроўкі, на якой апускалі труну з нябожчыкам у магілу. Такую вяроўку выключалі з гаспадарчай дзейнасці на наступныя 40 дзён: яе хавалі, каб ніхто з дамачадцаў не мог ёй скарыстацца.

◈ На працэс вырабу вяровак накладвалася шмат забарон. Напрыклад, нельга было віць вяроўкі ў святочныя дні, асабліва на Каляды; забаранялася рабіць гэта цяжарнай жанчыне, каб дзіця пры родах не было апавіта пупавінай.

---

**Даты | Падзеі | Людзі**

### 3 ЧЭРВЕНЯ

**1785** год — дзень нараджэння парашута — Франсуа Бланшар прадэманстраваў сканструяванае ім прыстасаванне. Першы эскіз парашута намаляваў яшчэ Леанарда да Вінчы ў 1483 годзе. Парашут Леанарда быў падобны на сучасны, аднак адсутнасць практычнай патрэбы ў яго выкарыстанні служыла перашкодай для вырабу падобных прыстасаванняў. Толькі развіццё паветраплавання ў XVIII стагоддзі заахвоцілі вынаходнікаў ушчыльную заняцца стварэннем апарата для спуску чалавека з вялікай вышыні. Упершыню пабудаваў і выпрабаваў такую прыладу французскі фізік Ленарман, які і даў яму назву — «парашут» (ад грэчаскага «пара» — супраць і французскага «шутэ» — падзенне). Ён меў конусападобную форму, быў пашыты з палатна і для памяншэння паветрапранікальнасці абклеены знутры паперай. Некалькі дзясяткаў тонкіх строп сыходзіліся да сядзення, сплеценага з вярбовых прутоў. Аднак ніхто з паветраплавальнікаў так і не скарыстаўся вынаходкай, хоць паспяховыя доследы з жывёламі, якіх вынаходнік скідаў на сваім парашуце з балкона абсерваторыі ў Манпелье з вышыні 26 метраў, даказалі яго надзейнасць. Нарэшце, 3 чэрвеня 1785 года французскі паветраплавальнік Франсуа Бланшар прадэманстраваў у Лондане сканструяваны ім парашут для скачкоў з паветранага шара. Сам Бланшар апрабаваць сваю вынаходку не адважыўся і з вышыні 300 м скінуў на парашуце сабаку. Жывёла прызямлілася ўдала. Праз год у Гамбургу Бланшар правёў чарговы эксперымент. На гэты раз з неба на зямлю спусціўся баран. Першым смельчаком, які з парашутам скокнуў з паветранага шара, стаў французскі аэранаўт Андрэ-Жак Гарнер. Здарылася гэта 22 кастрычніка 1797 года. Яго скачок з вышыні 400 метраў над парыжскім паркам Мансо стаў першым у Еўропе.

**1935** год — 80 гадоў таму нарадзіўся (вёска Мачулішча Крупскага раёна) Васіль Васільевіч Зуёнак, беларускі паэт, перакладчык. Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1959). Працаваў у рэдакцыях газет «Рабочае юнацтва», «Піянер Беларусі». У 1966-1972 гадах з'яўляўся намеснікам, у 1978-1982-м — галоўным рэдактарам літаратурнага часопіса «Маладосць», у 1972-1978 гадах — галоўным рэдактарам дзіцячага часопіса «Бярозка», у 1982—1989 гадах — сакратар, у 1990-1998-м — старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выдаў зборнікі «Крутаяр», «Сяліба», «Маўчанне травы», «Пісьмы з Таго свету» і інш. Аўтар цыкла паэм пра жыццё роднага краю і гістарычны лёс народа. Піша нарысы, літаратурна-крытычныя артыкулы і творы для дзяцей. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (1982).



**1938** год — нарадзіўся Мікалай Мікалаевіч Бамбалаў, беларускі вучоны ў галіне біягеахіміі. Член-карэспандэнт (1989), акадэмік НАН Беларусі (1994), доктар сельскагаспадарчых навук (1985). У 1962—1976 гадах — малодшы навуковы супрацоўнік, старшы інжынер, аспірант, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык лабараторыі Інстытута торфу, з 1976-га — загадчык лабараторыі Інстытута праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі НАН Беларусі (да 1990-га Інстытут торфу АН БССР). Асноўныя працы прысвечаны вывучэнню мінералізацыі арганічнага рэчыва ў глебах і балотах. Аўтар больш за 150 навуковых прац і 14 вынаходак.

**Было сказана**

**Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:**
*«Жыццё і падзеі, і людзі ўім праходзяць, нібы тыя рачныя хвалі».*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.43 | 21.33 | 16.50 |
| Віцебск | 4.25 | 21.30 | 17.05 |
| Магілёў | 4.33 | 21.23 | 16.50 |
| Гомель | 4.39 | 21.11 | 16.32 |
| Гродна | 5.00 | 21.47 | 16.47 |
| Брэст | 5.10 | 21.38 | 16.28 |

**Месяц**

*Поўня 2 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**

*Пр. Алены, Канстанціна, Міхаіла, Фёдара.*
*К. Тамары, Анатоля, Мацея.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




---

### УСМІХНЕМСЯ

**— Прывітанне, чым займаешся?**
**— Працую ў Акадэміі навук.**
**— А больш дакладна?**
**— У Інстытуце генетыкі.**
**— А яшчэ дакладней?**
**— У групе падрыхтоўкі матэрыялаў для эксперыментаў.**
**— Ну, а канкрэтна?**
**— Мошак для аналізаў лаўлю.**

Мой узровень валодання англійскай: narmalna.

**Дзяўчына з маленькімі грудзьмі выгадна адрознівалася ад сваіх сябровак з вялікімі тым, што магла бясплатна вынесці з супермаркета то два апельсіны, то два яблыкі.**




caricatura.ru

**ЗВЯЗДА** БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.117. Індэкс 63850. Зак. № 2137.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 чэрвеня 2015 года.